

ЧАМУ ЛЮДЗІ ВЫБІРАЮЦЬ ВЁСКУ

5

МАЛАДОСЦЬ МОЗГА ДА ГЛЫБОКАЙ СТАРАСЦІ

13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЛІПЕНЯ 2021 г. СУБОТА № 135 (29504)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай РАГАШЧУК, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці:**

*«Сустрэчы з людзьмі ў рэгіёнах заўсёды цікавыя, паступаюць часам незвычайныя прапановы. У большасці ж кожнага хвалююць свае пытанні, сярод іх ёсць і спрэчныя, якія могуць вырашыцца толькі ў судах. З чалавечага пункту гледжання зразумела жаданне людзей вырашыць праблему ў свой бок, але закон для ўсіх адзіны».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ ПАВІННЫ ПРЫКЛАСЦІ МАКСІМУМ НАМАГАННЯЎ, КАБ ЗАХАВАЦЬ ГЭТЫ ВЯЛІКІ ФЕСТЫВАЛЬ»



**«Наш фестываль стаў першай маштабнай культурнай падзеяй пасля развалу Савецкага Саюза. Калі былі разарваныя тысячы ніцяў, што звязваюць брацкія народы, ніхто нават уявіць не мог, якая роля была прадвызначана «Славянскаму базару». Тры дзесяцігоддзі таму мы пачалі шлях «праз мастацтва да міру і ўзаемаразумення», і нам удалося ўпісаць сваё свята ў каляндар культурнага жыцця многіх народаў, аб'яднаць аднадумцаў больш чым з 70 краін...»**

Гэтыя словы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі на цырымоніі адкрыцця XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» сталі своеасаблівым пралогам і дэвізам юбілейнага свята музыкі і сяброўства.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, калі на карце свету з'явіліся новыя славянскія і еўразійскія дзяржавы, калі ў гісторыі розных народаў пачалася новая эпоха, людзям, разгубленым і адарваным адно ад аднаго, як ніколі патрэбна была надзея на захаванне духоўных і брацкіх сувязяў. Гэтую надзею падарыў «Славянскі базар». «Ён даў усім упэўненасць у будучыні, падмурак якой быў закладзены савецкімі традыцыямі міжнацыянальнага міру», — падкрэсліў Прэзідэнт.

СТАР. 2



Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **ВУП Беларусі ў I паўгоддзі вырас на 3,3 %.**
- Тэнісны манеж пачалі будаваць у Пінску.
- **8 рэзідэнтаў «Вялікага каменя» займаюцца тэмай электратранспарту.**
- Класічныя вечары каля ратушы пачнуцца ў Мінску 17 ліпеня.
- **Памёр былы гендырэктар авіякампаніі «Белавія» Анатоль Гусараў.**



- Мабільныя групы па ахове працы за ліпень выявілі 1,7 тысячы парушэнняў у сельгасарганізацыях Беларусі.
- **У Мінскай вобласці ДАІ ў выхадныя будзе выкарыстоўваць негалосны кантроль.**
- Колькасць электрамабіляў у Беларусі павялічылася да 4 тысяч.
- **12-метровы пояс з крышталямі Swarovski можна ўбачыць на выставе ў Віцебску.**

ISSN 1990 — 763X

Абітурыент-2021

# 60 ХВІЛІН, КАБ КАНЧАТКОВА ВЫЗНАЧЫЦЦА З ПРАФЕСІЯЙ

## Апошняе абнаўленне інфармацыі аб ходзе падачы дакументаў адбудзецца ў 17 гадзін

**20 ліпеня стартуе другі этап уступнай кампаніі: у гэты дзень прыёмныя камісіі ВНУ распачнуць прыём дакументаў ад абітурыентаў. Сёлета на бюджэтную форму навучання плануецца прыняць 27,8 тысячы чалавек і больш як 27 тысяч — на платную. Невялікае павелічэнне набору на бюджэт адбудзецца па медыцынскіх, тэхнічных і асобных педагагічных спецыяльнасцях.**

СТАР. 7



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# «МЫ ПАВІННЫ ПРЫКЛАСЦІ МАКСІМУМ НАМАГАННЯЎ, КАБ ЗАХАВАЦЬ ГЭТЫ ВЯЛІКІ ФЕСТЫВАЛЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Для беларусаў фестываль стаў адным з сімвалаў станаўлення незалежнай дзяржавы. Так, бывалі вельмі няпростыя часы. Але мы беraглі «Славянскі базар». І насуперак усім цяжкасцям свята жыло», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт канстатаваў, што разам з фестывалем вырасла цэлае пакаленне беларусаў, фестываль укараніўся на зямлі, якую па праве можна лічыць калыскай беларускай самабытнасці. «Віцебшчына, якая падарыла нам Шагала, Пэна, Азгура, Быкава і Фрадкіна, стала цэнтрам прыцягнення для творчых людзей у XXI стагоддзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння фестываль у Віцебску — самы аўтарытэтны міжнародны конкурс прафесійнага вакальнага майстэрства. «Падкрэслю — конкурс прафесійнага майстэрства, а не шоу-тэхналогій, створаных толькі для іміджу і жадання пацешыць нечае самалюбства. Ён існуе ў імя людзей, сяброўства і адзінства, таму што толькі ў адзінстве народаў ёсць сіла, якая пераадольвае любыя перашкоды, — заявіў Прэзідэнт. — І як бы ні курчыліся ў інсінуацыях крытыкі дзяржаўнай і маёй асабістай падтрымкі «Славянскага базару», мы яго адстаялі і ні разу не пашкадавалі, што кожны год праводзім гэты выдатны фестываль».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што артысты, мастакі, рамеснікі з розных краін і кантынентаў, якія прыязджаюць на фестываль, заўсёды гавораць на адной мове — мове сяброўства, мастацтва і творчасці. «І таму ніці «Славянскага базару» працягваюць звязваць людзей у свеце, які ўжо даўно не быў такі падзелены, як цяпер — і не толькі пандэміяй і гібрыднымі войнамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што ў той час, як некаторыя дзяржавы будуюць платы, падзяляючы людзей калючым дротам, Беларусь адчыніла свае дзверы для сяброў.

Квіток на фэст дазваляе наведаць Беларусь грамадзянам 74 дзяржаў без віз. «А сябрам Беларусі запрашэнне ніколі і не патрабавалася, — дадаў ён. — Мы заўсёды па-беларуску рады гасцям і соты раз паўтараем: прыязджайце, паглядзіце на нашу краіну — нам ёсць чым ганарыцца і чым вас прыемна здзівіць», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сцэна Летняга амфітэатра ў Віцебску памятае вялікіх Уладзіміра Мулявіна, Людмілу Зыкіну, Ігара Лучанка, Эдзіту П'еху, Мішэля Лэграна і Андрэя Пятрова. Яна стала стартам для яркай кар'еры папулярных артыстаў: Таісіі Павалій і Русланы, Пятра Ялфімава і Алены Ланской, Дзімаша ды многіх іншых.

«Тут кожны год робяць свае першыя творчыя крокі ўдзельнікі дзіцячага музычнага конкурсу — гэта будучыня нашых краін. Бо ў канчатковым выніку ўсё гэта адбываецца для таго, каб захаваць пераемнасць пакаленняў, асвятліць шлях творчай моладзі, паказаць найлепшыя прыклады, але ў той жа час даць прастору для рэалізацыі новых ідэй і напрамкаў. І мы верым, што наша моладзь напіша яшчэ шмат яркіх старонак у жыцці фестывалю, годна працягне пачатае намі. Хай у новым фармаце, хай нават на незразумелай нам мове, але з той жа светлай мэтай — «праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, аб'яднаўшы на адной сцэне прадстаўнікоў усіх славянскіх народаў, народаў былых саюзных рэспублік, прыцягваючы з кожным годам удзельнікаў і гасцей з новых краін, фестываль не мог не стаць раздражняльнікам для тых, каму не трэба адзінства гэтых краін. «Раздражняе іх наша дзейства, і справа тут не ў дыктатуры, не ў тым, што краіна не такая. З'явіліся новыя метады барацьбы на падзел народаў. Нас спрабуюць падзяліць, таму мы павінны прыкласці максімум намаганняў, каб захаваць гэты вялікі фестываль, які тры дзесяцігоддзі радуе народ. Тым, хто не хоча, каб людзі з іншых дзяржаў убачылі Беларусь на свае вочы, а не праз прызму фальшывых СМІ і Telegram-каналаў, мы павінны сказаць: прыязджайце да нас, дзверы адчыненыя. Аблудныя, ачмураныя — паглядзіце на нас», — дадаў беларускі лідар.

Але, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, няглед зячы на ўсе абставіны, са сцэны Летняга амфітэатра ў Віцебску гучаць тры брацкія ўсходнеславянскія мовы: беларуская, руская і ўкраінская. А таксама мова міжнародных зносін. «Калі ласка, размаўляйце на любой мове, мы нікому не закрываем рот. Але аснова — гэта наша, славянскае, мужных славян — гэтыя тры выдатныя мовы. Нас апошні час хістаюць, як вы бачыце, спрабуюць адарваць, разарваць. Спрабуюць нашу родную Украіну адарваць ад гэтага адзінства», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што ўдзел украінскіх артыстаў у «Славянскім базары» і ўкраінка сярод вядучых фестывалю — сведчанне таго, што з гэтых спроб нічога не выйдзе. «Мы як былі, так і будзем разам. І гэтыя вялікія мовы гучалі і заўсёды будуць гучаць, таму што яны належаць народам», — падкрэсліў ён.

«Мы, прысутныя тут, і перш за ўсё беларусы, як і раней, з гэтай культурнай пляцоўкі заклікаем краіны і нацыі ўзводзіць масты, а не сцены, свята захоўваць славянскае братэрства, умацоўваць сяброўства з усімі дзяржавамі свету», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў: штогадовыя спецыяльныя ўзнагароды і прэміі — гэта толькі малая частка прызнання таго ўкладу, які на справе ўносяць творчыя людзі ва ўмацаванне сувязяў паміж брацкімі народамі. Ён заявіў, што залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю фестывалю імёны драматурга Аляксея Дударава, народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, народных артыстаў Расіі і Беларусі Аляксея Пятрэнкі, Уладзіміра Гасцюхіна, дырыжора Міхаіла Фінберга, народнага мастака Савецкага Саюза Міхаіла Савіцкага, кампазітара Аляксандры Пахмутавай, паэта Мікалая Дабранравава і, вядома ж, першага дырэктара фестывалю Радзівона Баса.

«Гэтыя людзі — і ў гэтым іх асаблівасць — ніколі не спрабавалі прыстасавацца пад палітычную ці іншую кан'юнктуру, не лавілі хайп, а былі сапраўднымі падзвіжнікамі мастацтва, пасламі міру і сяброўства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падзякаваў артыстам і арганізатарам, жыхарам і гасцям Віцебска — усёй вялікай сям'і фестывалю — «за тое, што, як і 30 гадоў таму, мы адчуваем гэтую дзіўную атмасферу свята і народнага адзінства».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Колькасць загінулых у паводцы ў Германіі перавысіла 100 чалавек

**Колькасць загінулых у выніку паводкі на захадзе Германіі вырасла да 100 і, верагодна, працягне расці. Пра гэта піша Tagesschau.**

Паведамляецца, што асноўная частка загінулых — гэта жыхары федэральнай зямлі Паўночны Рэйн — Вестфалія і федэральнай зямлі Рэйнланд-Пфальц.

Ратавальныя службы пакуль не могуць дабрацца да некаторых населеных пунктаў, якія былі моцна пашкоджаны паводкай. У тым ліку з-за гэтага прапаўшымі лічыцца больш за 1,3 тысячы людзей. СМІ называюць тое, што адбылося, «патопам стагоддзя»: такой моцнай і настолькі смяротнай паводкі сапраўды не здаралася ў Германіі многія дзесяцігоддзі.

Улады задзейнічалі дадатковыя сілы ваенных для барацьбы з наступствамі катастрофы: вядома, што за апошнія суткі ў работу ўключылася больш за 850 вайскоўцаў. Прычынай паводкі сталі рэкордна моцныя дажджы, з-за якіх рэкі выйшлі з берагоў. Стыхійнае бедства таксама закранула суседнія Бельгію і Нідэрланды.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне народу Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі ў выніку катастрафічнай паводкі. Ад імя беларускага народа і сябе асабіста кіраўнік дзяржавы выказаў словы салідарнасці, шчырага спачування і падтрымкі родным і блізкім загінулых, а таксама пажадаў хутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым.**

### У Амстэрдаме адкрылі мост, які надрукавалі на 3D-прынтары



**У Амстэрдаме з удзелам каралевы Максімы адкрылі мост над каналам, надрукаваны на 3D-прынтары. На 12 метраў канструкцыі пайшло 4,5 тоны сталі. На яго выраб спатрэбілася паўгода. Паведамляецца, што мост часовы. Праз два гады на гэтым месцы з'явіцца звычайны мост, які цяпер на рэстаўрацыі.**

Мост у Амстэрдаме — першы ў свеце, выраблены са сталі і надрукаваны на 3D-прынтары.

Агенцтва AP адзначае, што мост знаходзіцца ў самым цэнтры раёна «чырвоных ліхтароў» у Амстэрдаме.

### У ПАР у беспарадках загінулі 117 чалавек

**Беспарадкі ў ПАР, якія пачаліся 9 ліпеня ў правінцыі Квазулу-Наталь, а затым распаўсюдзіліся на суседнюю правінцыю Гаўтэнг, прывялі да гібелі 117 чалавек, заявіла міністр развіцця малога бізнесу ПАР Кумбудза Нтшавені.**

«У Квазулу-Наталь загінуў 91 чалавек, арыштаваных за ўдзел у беспарадках — 1478. У Гаўтэнгу загінулі 26 чалавек», — сказала Кумбудза Нтшавені на брыфінгу. Яна адзначыла, што цяпер сітуацыя ў сталічнай правінцыі Гаўтэнг у цэлым спакойная.

У сваю чаргу, міністр дзяржаўнай бяспекі ПАР Зізі Кодва заявіў, што ўраду ўдалося ўзяць сітуацыю пад кантроль у абедзвюх правінцыях. «Мы будзем працягваць спыняць любыя спробы дэстабілізаваць дзяржаву і падарваць яе бяспеку», — пазначыў кіраўнік паўднёваафрыканскіх спецслужбаў.

З мінулай пятніцы прыхільнікі пасаджанага 8 ліпеня ў турму былога кіраўніка дзяржавы Джэйкаба Зумы пачалі перакрываць у правінцыі Квазулу-Наталь асноўныя дарогі. Яны абвясцілі пра пачатак кампаніі «Свабоду Зуме», каб дамагчыся яго хутчэйшага вызвалення, і заклікалі насельніцтва правінцыі далучацца да іх акцый пратэсту. Дэманстрацыі паўсюдна перараслі ў буйныя беспарадкі.

### Самую старую ў свеце бутэльку віскі прадалі на аўкцыёне амаль за 140 тысяч долараў

**ЗША прадалі на аўкцыёне бутэльку віскі, якая лічыцца самай старой у свеце. Яна пайшла з малатка за 137,5 тысячы долараў (350 тысяч рублёў). Пра гэта паведамляе часопіс Food&Wine.**

Эксперты чакалі, што выручка ад продажу бутэлькі Old Ingledew складзе ўсяго ад 20 да 40 тысяч долараў, аднак падчас таргоў кошт лота ў некалькі разоў перавысіў іх ацэнку.

Лічыцца, што прададзенае віскі было разлітае каля 250 гадоў таму ў амерыканскім горадзе Лаграндж, штат Джорджыя. У 1902 годзе ўладальнікам найстарэйшай бутэлькі стаў знакаміты фінансіст Джон Пірпонт Морган-старэйшы.

Віскі захоўвалася ў яго ным склепе, пакуль у пачатку 1940-х сын фінансіста не аддаў яго ў падарунак. «Самая старая з вядомых бутэлек віскі» дасталася паліткy Джэймсу Бірнсу, а дзве іншыя бутэлькі атрымалі Франклін Рузвельт і Гары Трумэн, 32-і і 33-і прэзідэнты ЗША.

Пазней Бірнс перадарыў бутэльку блізкаму сябру і суседу Фрэнсісу Дрэйку, сям'я якога і захоўвала яе на працягу трох пакаленняў.

## Адным шляхам

# «Кітай і Беларусь — надзейныя сябры»

**Аб гэтым на сустрэчы з першым намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі Мікалаем СНАПКОВЫМ заявіў міністр замежных спраў КНР Ван І.**

Беларусь імкнецца паглыбіць шматвектарнае супрацоўніцтва з Кітаем і вывесці на новую прыступку міждзяржаўныя адносіны. Пра гэта заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў падчас сустрэчы ў Ташкенце з членам Дзяржсавета, міністрам замежных спраў КНР Ван І, паведамілі БелТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Мінск цвёрда падтрымлівае Пекін па пытаннях, што датычацца яго асноўных інтарэсаў, і заўсёды стаіць на ягоным баку, а таксама гатовы сумесна супрацьстаяць дзеянням у духу «псеўдамультылатэралізму», накіраваным на раскол свету, і актыўна прасоўваць фарміраванне супольнасці з адзіным лёсам для ўсяго чалавецтва, падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

Ван І, у сваю чаргу, заявіў, што Кітай і Беларусь — надзейныя сябры. Ён падкрэсліў, што неабходна ўвасобіць у жыццё дамоўленасці кіраўнікоў дзвюх дзяржаў, прытрымлівацца духу ўзаемадавеpу, супрацоўніцтва і ўзаемнага выйгрышу, няўхільна паглыбляць традыцыйную дружбу і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва, каб садзейнічаць далейшаму ўпэўненаму развіццю кітайска-беларускіх адносін.

Ван І таксама адзначыў, што Пекін і Мінск маюць добрыя традыцыі ўзаемнай падтрымкі і ўзаемадапамогі. Дыпламат выказаў падзяку Беларусі за тое, што яна заўсёды цвёрда стаіць на баку Кітая па пытаннях, што датычацца яго асноўных інтарэсаў, і падтрымлівае яго пазіцыі. Калі Беларусь сутыкнецца з цяжкасцямі, КНР як усёабдымны стратэгічны партнёр таксама будзе з усіх сіл аказваць ёй падтрымку і дапамогу, як і належыць паступаць сябрам, заявіў Ван І.

Па словах міністра, Кітай цвёрда падтрымлівае Беларусь у абароне нацыянальнага суверэнітэту і годнасці, выступае супраць неапраўданых аднабаковых санкцый і ўмяшання ў яе ўнутраныя справы, а таксама гатовы абараняць законныя правы і інтарэсы Беларусі ў шматбаковых рамках. Пекін гатовы сумесна з Мінскам працаваць над далейшым развіццём міждзяржаўных сувязяў і паглыбленнем двухбаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Кітай працягне пастаўляць Беларусі вакцыны, каб дапамагчы ёй як мага хутчэй поўнасцю пераадолець пандэмію, адзначыў Ван І.

На слыху

# ТРАЎМАТЫЧНАЯ ЗБРОЯ, БОЕПРЫПАСЫ, НАРКОТЫКІ...

## Сілавікі расказалі аб папярэджанні і расследаванні злачынстваў, звязаных з пратэснай дзейнасцю

**У Беларусі працягваецца комплекс мер па зачыстцы ад радыкальна настроеных асоб. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік начальніка следчага ўпраўлення КДБ Канстанцін БЫЧАК, паведамляе БелТА.**

«Камітэтам дзяржаўнай бяспекі ва ўзаемадзеянні са Следчым камітэтам і іншымі праваахоўнымі органамі працягваецца комплекс мерапрыемстваў па зачыстцы ад радыкальна настроеных асоб. У найбольш актыўных падпісчыкаў дэструктыўных Telegram-каналаў, такіх як ОГСБ, «Буслы ляцяць», Exomon і іншых, адносна якіх мелася аператыўная інфармацыя аб дачыненні да экстрэмісцкай дзейнасці, праведзены вобыскі. Канфіскавана траўматычная зброя, боепрыпасы, наркатычныя сродкі, нацысцкая сімволіка і атрыбутыка», — расказаў Канстанцін Бычак.

Паводле яго слоў, у дачыненні да некаторых асоб здабытыя доказы іх датычнасці да здзяйснення дзеянняў, якія крымінальна караюцца. «Такіх як арганізацыя групавых дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, і ўдзел у іх, а таксама распальванне сацыяльнай варожасці або розні», — адзначыў намеснік начальніка.

Следчым камітэтам працягваецца расследаванне шэрагу крымінальных спраў аб злачынствах, якія ў той ці іншай ступені звязаны з пратэснай дзейнасцю: у тым ліку крымінальныя справы ў дачыненні да членаў пазбаўленага рэгістрацыі грамадскага аб'яднання «Вясна», паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі Уладзімір ШЫШКО.**

«У ходзе расследавання названых крымінальных спраў атрымана дакладная інфармацыя аб дачыненні кіраўнікоў і работнікаў шэрагу недзяржаўных арганізацый і аб'яднанняў, а таксама прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі да ценявага руху значных фінансавых сродкаў, у першую чаргу тых, што паступаюць з-за мяжы, нявыплаце падаткаў і фінансаванні рознага роду пратэснай актыўнасці насельніцтва Беларусі. Калі казаць пра гэта больш дэталёва, то мы вядзём гаворку аб дзейнасці па зборы асоб у канкрэтных месцах для здзяйснення групавых супрацьпраўных дзеянняў, аплаце адміністрацыйных спагнанняў, накладзеных за ўдзел у незаконных масавых мерапрыемствах, арганізацыі і правядзенні семінараў па пытаннях супрацьдзеяння праваахоўным органам і іншае», — расказаў Уладзімір Шышко.

Паводле яго слоў, для дадатковай праверкі інфармацыі аб дачыненні да ўказаных незаконных дзеянняў членаў недзяржаўных арганізацый 14—15 ліпеня праведзены вобыскі па месцах жыхарства дадзеных грамадзян і размяшчэння офісаў іх арганізацый.

«У ходзе далейшага расследавання крымінальных спраў забраныя падчасператрусаў прадметы, дакументы і інфармацыя будуць агледжаны і прааналізаваны, па выніках чаго будзе дадзена адпаведная прававая ацэнка. Ужо цяпер можна сказаць, што першапачатковая інфармацыя аб дачыненні шэрагу арганізацый і яе членаў да незаконнай дзейнасці знайшла сваё пацвярджэнне», — адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Як дадалі ў СК, працягваецца расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да Андрэя Аляксандрава. Устаноўлена, што ён займаўся зборам грашовых сродкаў, перададзеных у выглядзе закладак у схованках ад прадстаўнікоў арганізацый BY_help і BYSOL, аплатай штрафаў, паслуг адвакатаў і іншых расходаў асоб, звязаных з іх удзелам у пратэснай дзейнасці, у тым ліку з выкарыстаннем раней перададзеных ім банкаўскіх плацежных карт замежных банкаў. Следствам устаноўлена не менш за 700 фактаў такой аплаты.

«Следствам атрыманыя доказы, што злачынны намер Аляксандрава быў накіраваны на аказанне дапамогі замежным арганізацыям Linking Media (BY_help) і Stichting Belarus Solidarity Foundation (BYSOL) у правядзенні дзейнасці, накіраванай на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Беларусі, а менавіта асноўным нацыянальным інтарэсам краіны ў палітычнай, інфармацыйнай і сацыяльнай сферы», — адзначылі ў ведамстве.

Акрамя таго, устаноўлены сумы наяўных ганарараў грамадзяніну Беларусі Валянціну Жданко як супрацоўніку кампаніі Radio Free Europe за яго журналісцкую дзейнасць у перыяд з 2017 да 2020 года — яны вар'іраваліся ад $2 тысяч да $23 тысяч. Сумарна за названы перыяд яму было налічана больш за $230 тысяч.

Будзь у курсе

# На Балтыку — без перашкод

**З сённяшняга дня грамадзяне Беларусі маюць магчымасць праезду чыгуначным транспартам у Калінінградскую вобласць, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.**

У адпаведнасці з пастановай Саўміна ад 14 ліпеня 2021 года, зняцця абмежаванні па перасячэнні дзяржграніцы Беларусі для тых, хто едзе з краіны на тэрыторыі Калінінградскай вобласці па чыгунцы без перасадак у дарозе. Гэта датычыцца грамадзян Беларусі, Расіі і замежнікаў, якія маюць дазвол на пастаяннае або часовае пражыванне на тэрыторыі Беларусі, а таксама іх жа, калі яны едуць назад.

БЧ звяртае ўвагу пасажыраў, што ў адпаведнасці з дзеючымі правіламі для праезду з Беларусі ў Калінінградскую вобласць (па тэрыторыі Літвы), беларускім грамадзянам неабходна мець шэнгенскую візу.

У цяперашні час у зносінах з Калінінградскай вобласцю па тэрыторыі Беларусі курсіруюць цягнікі № 30 / 29 Калінінград — Масква, № 80 / 79 Калінінград — Санкт-Пецярбург і № 360 / 359 Калінінград — Адлер. Ажыццяўленне праезду названымі цягнікамі прадугледжана толькі для грамадзян Беларусі і Расіі.

Пры знаходжанні на чыгуначных вакзалах і ў цягніках неабходна выкарыстоўваць індывідуальныя сродкі абароны органаў дыхання і антысептычныя сродкі.

У БЧ нагадваюць, што з 10 ліпеня беларускія грамадзяне могуць уехаць на цягніку ў Расійскую Федэрацыю толькі з адмоўным вынікам ПЦР-тэста, зарэгістраваным



з выкарыстаннем мабільнага дадатку «Падарожнічаю без COVID-19».

У адпаведнасці з пастановай Саўміна, грамадзяне дзяржаў — членаў ЕАЭС (у тым ліку Расіі), якія дасягнулі шасцігадовага ўзросту, за выключэннем тых, хто мае дазвол на пастаяннае або часовае пражыванне на тэрыторыі Беларусі, прыбываючы ў нашу краіну, таксама прад'яўляюць адмоўны вынік ПЦР-тэста, зарэгістраваны з выкарыстаннем мабільнага дадатку «Падарожнічаю без COVID-19».

Больш падрабязную інфармацыю аб графіку руху дадзеных цягнікоў, правілах і кошту праезду можна атрымаць на сайце www.rw.by, у мабільным дадатку «БЧ. Мой цягнік», а таксама па тэлефоне кантакт-цэнтра БЧ 105.

# «100 гадоў — 100 фота»

## Праект з такой назвай рэалізавалі ў БДУ

**У яго канцэпцыю пакладзена ідэя паказаць праз гістарычную анлайн-фотагалерэю станаўленне і сучаснасць першай і адной з найстарэйшых бібліятэк ВНУ Беларусі. У пачатку XX стагоддзя яна не толькі забяспечвала адукацыйны працэс у БДУ, але і стала заснавальніцай нацыянальнай бібліятэчнай сеткі. У 1926 годзе на яе базе стварылі Беларускую дзяржаўную бібліятэку, вядомую цяпер як Нацыянальная бібліятэка Беларусі.**

Фотагалерэя аформлена ў храналагічным парадку і структурна падзелена на перыяды: 1921—1960, 1961—1990, 1991—2021 гады. Фота адлюстроўваюць самыя розныя бакі дзейнасці бібліятэкі за векавую гісторыю яе існавання: знамянальныя падзеі, нюансы працы супрацоўнікаў, асобы наведвальнікаў. Напрыклад, першы здымак датуецца 1934 годам. Ён адлюстроўвае працу бібліятэкара і абслугоўванне наведвальнікаў. На фота 1983 года можна ўбачыць урачыстае адкрыццё чытальнай залы геаграфічных навук, а фота, датаванае 1978 годам, зафіксавала сустрэчу з народным пісьменнікам Беларусі Янкам Брылём. У сучасным раздзеле можна ўбачыць наведванне Фундаментальнай бібліятэкі намеснікам старшыні КНР Ван Цішанем у 2018 годзе, а ў 2021-м — устаноўку ўнікальнага кніжнага сканера.

Стварэннем і напаўненнем фотагалерэі займаліся супрацоўнікі аддзела аўтаматызацыі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Усе матэрыялы ўзятыя і алічбаваныя з архіваў і памятных альбомаў універсітэта, а таксама з асабістых калекцый супрацоўнікаў.

У цяперашні час бібліятэка захоўвае амаль 2 мільёны тамоў фонду айчыннай і замежнай літаратуры, абслугоўвае больш за 25 тысяч карыстальнікаў, штогод ажыццяўляе звыш 1,5 мільёна кнігавыдач і зваротаў да электронных інфармацыйных рэсурсаў. Паводле міжнароднага рэйтынга «Transparent Ranking of Repositories», Электронная бібліятэка БДУ ўваходзіць у тройку найлепшых універсітэцкіх рэпазіторыяў у свеце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Добрая навіна

# У Быхаве адкрываецца новая скейт-пляцоўка

**Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БелТА дырэктар Быхаўскага раённага фізкультурна-аздараўленчага цэнтра Вольга МАЛАШОНАК.**

«Пляцоўка размесціцца на тэрыторыі нашай установы і будзе складацца з шасці базавых для гэтага віду спорту элементаў, розных па вышыні і памерах, — адзначыла Вольга Малашонак. — Ініцыятарамі стварэння такога сучаснага аб'екта сталі юныя быхаўскія райдары, а гарадскія ўлады пайшлі ім насустрач. У перыяд летніх канікул важна, каб дзеці не сядзелі перад экранамі тэлевізараў і смартфонаў, а праводзілі час на вуліцы ў жывых зносінах між сабой і ў здаровай фізічнай актыўнасці».

Аматары катання на роліках і скейтбордах зараз змогуць удасканальваць свае навыкі на рознага роду трамплінах, парэнчах і рознаўзроўневых горках, прызначаных для набору і захавання хуткасці руху. На тэрыторыі фізкультурна-аздараўленчага цэнтра будуць устаноўлены такія фігуры, як бэнк, кікер, фанбокс, кватэрпайп, рэйл і менуалпад.

«Кіраўніцтва райвыканкама нацэлена на тое, каб у кожнай буйной гарадской зоне з'яўляліся спецыялізаваныя спартыўныя пляцоўкі для моладзі, — расказала Вольга Малашонак. — Так, летась у парку 50 гадоў Перамогі мы адкрылі варкаўт-пляцоўку. Сёлета ўстановім абсталяванне для скейтараў. У далейшым парадуем нашых дзяцей яшчэ адным новым спартыўным аб'ектам».


## Извещение о проведении тендера (конкурса) на использование радиочастотного спектра

В соответствии с решением Государственной комиссии по радиочастотам при Совете Безопасности Республики Беларусь (далее – Государственная комиссия) от 17 декабря 2020 года № 32К/20 «О проведении тендера (конкурса) на использование радиочастотного спектра» Министерство связи и информатизации Республики Беларусь (далее – Организатор) проводит тендер (конкурс) на использование радиочастотного спектра (далее – Конкурс) и приглашает юридических лиц и индивидуальных предпринимателей принять участие в Конкурсе.

**Полное наименование Организатора и сведения о его месте нахождения:**

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь, пр-т Независимости, 10, 220050, г. Минск.

**Краткое описание предмета Конкурса:**

Предметом Конкурса является выделение Государственной комиссией радиочастоты 98,6 МГц с шириной полосы ± 150 кГц для эксплуатации радиоэлектронных средств (далее – РЭС) радиовещательной службы на территории площадью 4392,26 кв. км при размещении РЭС на областной радиотелевизионной передающей станции «Ракитница» с целью оказания услуг электросвязи общего пользования (эфирная трансляция звуковых программ).

**Сведения о месте, дате и времени проведения Конкурса:**

Место проведения Конкурса: пр-т Независимости, 10, 220050, г. Минск.

Дата и время проведения Конкурса: в 10.00 (время местное) 24 августа 2021 г.

**Сведения о месте и порядке представления конкурсных документов:**

Конкурсные документы выдаются по месту нахождения Организатора в период с 10.00 (время местное) 19 июля 2021 г. до **10.00** (время местное) 23 августа 2021 г. на основании письменного запроса юридического лица или индивидуального предпринимателя о представлении конкурсных документов. Плата за выдачу конкурсных документов не взимается.

**Сведения о месте, дате и времени начала и окончания приема конкурсных предложений:**

Конкурсные предложения принимаются по адресу: пр-т Независимости, 10, 220050, г. Минск, Министерство связи и информатизации Республики Беларусь.

Дата и время начала приема конкурсных предложений: **10.00** (время местное) 19 июля 2021 г.

Дата и время окончания приема конкурсных предложений: 15.00 (время местное) 23 августа 2021 г.

**Требования к юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям, которые могут быть участниками Конкурса:**

В Конкурсе могут принять участие юридические лица и индивидуальные предприниматели, представившие конкурсные предложения, оформленные в соответствии с требованиями конкурсных документов и Положением о порядке проведения Конкурса на использование радиочастотного спектра, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 сентября 2009 г. № 1259.

**Номер контактного телефона Организатора для уточнения и получения дополнительной информации:**

+ 375 17 287 88 06 (Лифоренко Сергей Анатольевич);
+ 375 17 287 87 68 (Климович Никита Александрович);
факс: + 375 17 327 21 57.
E-mail: mpt@mpt.gov.by

# КАЗАЧНА! ЧАРОЎНА! ФЕЕРЫЧНА!



**Канцэрт ганаровага адкрыцця XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» прадэманстраваў, што ў Беларусі ўмеюць арганізоўваць маштабныя культурныя мерапрыемствы на самым высокім узроўні.**

## Месца, дзе здзяйсняюцца мары

Гэтую высокамастацкую казку, творчы цуд, яскравую феерыю па тэлебачанні і ў інтэрнэце ўбачылі і ўбачаць мільёны людзей. Летась прагляд трансляцый на афіцыйным сайце «Базару» і ў сацыяльных сетках перавысіў 7,5 мільёна. Самыя рэйтынгавыя шоу — адкрыцця і закрыцця фэсту. У дырэкцыі лічаць, што названая вышэй лічба — не мяжа.

За ўсе гады правядзення фестывалю афармленне сцэны не паўтаралася. Колькі б ні даражэла адпаведнае задавальненне, арганізатары не шкадавалі грошай, каб была прыгожая карцінка як для тых, хто ў зале, так і для тэлегледачоў. Сёлета сцэна зроблена ў выглядзе чароўнага куфэрка, напоўненага талентамі. Перыядычна яна нагадвала лабірынт з люстэрка. Часам сцэна станавілася дзіцячым пакоем, дзе рэалізоўваюцца мары. Святлодыёдныя экраны, здавалася, гнуліся, лятаі, падымаліся і апускаліся. Карцінка асвятлення трансфармавалася — хацелася глядзець і глядзець, стаіўшы дыханне.

Вакол галоўнай сцэнічнай пляцоўкі дызайнеры і спецыялісты па азеляненні зрабілі чарговую прыгажосць: ужо мноства сэлфі і фота зроблена на фоне паўліна з раслін, вялікага скрыпічнага ключа і эмблемы фестывалю — валошкі.



У гэтым годзе, юбілейным для «Базару», многае адбылося ўпершыню. Цырымонія ўзняцця сцяга на пляцоўцы каля Летняга амфітэатра пачалася ў першыя секунды пасля апоўначы. Ноч, і раптам — прадстаўленне «Святло часу». Кавалак гарадскога асяроддзя каля «сэрца» «Базару» пераўтварыўся ў міні-казку з падсветкай, феерверкамі, ілюмінацыяй у руках акцёраў. На імправізаванай сцэне выступілі артысты і «жывыя скульптуры». Гэты сюрпрыз стаў цудоўным падарункам гледачам.




Сцяг фестывалю паднялі зорка сусветнай велічыні, уладальнік Гран-пры XXIV Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2015» Дзімаш Кудайберген (Казахстан) і пераможца леташняга дзіцячага музычнага конкурсу «Базару» Ангеліна Ламака (Беларусь).

Больш за пяць тысяч удзельнікаў «Базару» прадстаўляюць каля трыццаці пяць краін. У фестывальнай праграме больш чым паўтары сотні мерапрыемстваў. Колькасць гасцей свята цяжка падлічыць.





## Грамадзяне фестывалю

На адкрыцці прэс-цэнтра **кіраўнік дырэкцыі XXX Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Глеб ЛАПІЦКІ** заявіў: удзельнікі фестывалю з 14-гадовым стажам і больш атрымаюць адмысловы пашпарт. Маўляў, у Беларусі ўручаюць пашпарты грамадзяніна ва ўзросце ад 14 гадоў. Першай незвычайны сувенір атрымала заслужаная артыстка Беларусі Алена Спірыдовіч, адна з вядучых галоўных фестывальных праектаў. Без яе цяжка ўявіць «Базар».

**Міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ** уручыў работнікам сродкаў масавай інфармацыі ганаровыя граматы за актыўную плённую працу па асвятленні мерапрыемстваў фэсту. Паводле яго слоў, больш за 400 чалавек з 76 СМІ сёлета працуюць на фестывалі. Сярод іх і 62 журналісты з 33 замежных медыя. У прыватнасці, з Расіі, Эстоніі, Казахстана, Сербіі, Літвы і іншых.

## Россып выстаў

На сёлетнім «Базары» вельмі багатая музейная праграма. У ратушы адкрылася этнаграфічная выстава з прыватнай калекцыі Людмілы Каюравай «Амто, Каракія!». Першае слова перакладаецца як «прывітанне».

Яна знаёміць з яркай і самабытнай матэрыяльнай культурай карэнных малалікіх народаў, якія пражываюць на паўночнай ускраіне Расіі: каракаў, чукчаў, ітэльменаў, эвенаў і іншых. Выстава ладзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры Камчацкага краю Расійскай Федэрацыі. Увазе гледачоў прадстаўлена больш чым шэсцьдзясят карцін, выкананых у розных тэхніках. Лепш зразумець непаўторныя паўночныя пейзажы і людзей, якія жывуць у гармоніі з прыродай Крайняй Поўначы, дапамогуць прадметы побыту. А яшчэ — этнаграфічныя і рытуальныя рэчы і прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выкананыя з футра паўночнага аленя, нерпы, маржа, скуры і пацерак, у традыцыйнай манеры разьбы і гравіроўкі па косці, маржовым клыку і дрэве.

Наведвальнікі ўбачаць традыцыйныя адзенне, абутак і паясы паўночных народаў. Сярод экспанатаў — сапраўдны рарытэт, падобных якому захавалася толькі некалькі адзінак, — жаночы краільны нож. Уражвае калекцыя жаночых сумачак для паўночнага рукадзелля з лапак дзікіх гусей, лебедзя, качак і рыбінай скуры. Ёсць і мужчынскія каракскія і эвенскія кісеты і табакерка, рытуальныя скураныя акуляры і іншае.





У Музеі гісторыі прыватнага калекцыяніравання (які з'яўляецца адным з філіялаў Віцебскага абласнога краязнаўчага) учора ў рамках «Базару» адбылося адкрыццё выставы работ фатографа Хаміда Хусейна і мастака Джымі Інжынера «Скарбы Пакістана». На цырымоніі адкрыцця прысутнічаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Беларусі Саджад Хайдэр Хан. Дыпламат выказаў жаданне кожны год прадстаўляць культуру Пакістана на віцебскім фестывалі. «Скарбы Пакістана» можна будзе ўбачыць да 29 ліпеня.

У Віцебску з раніцы да глыбокай ночы цяпер адбываецца нешта цікавае. Шмат ахвотных пачуць выступленні вулічных музыкантаў, купіць сувеніры ў горадзе майстроў, пасядзець з сям'ёй і сябрамі ў кавярні пад адкрытым небам. Транспарт курсіруе круглыя суткі, так што дабрацца дамоў ці ў гатэль не праблема.





**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота БелТА.**

# ЛЮБОЎ МАЯ — ВАСІЛЬКІ, ЛЁС — ВІШОЎ

## Чаму Святлана Магілеўчык і яе сям'я ніколі не памяняюць вёску на горад



**Летам тут любата: стракозы, матылькі, кветкі, зеляніна. Зусім не хочацца вяртацца ў горад, які дыхае гарачым асфальтам. Святлана патэлефанавала мне некалькі тыдняў таму. У іх з Анатолем дамашняй гаспадарцы папаўненне: карова Міра нарадзіла Зорачку. Нават імя прыдумваць не прыйшлося — яно ў яе на лбе было «напісана». Такая белая плямка — зорачка, адным словам. Святлана падзялілася радасцю, паабяцала, што напоіць дамашнім малаком і накорміць клубніцамі. Пакуль збіралася, ягады адышлі. Затое Зорачка падрасла і з задавальненнем пазіравала на камеру. Што з яе ўзяць, адразу відаць — дзяўчынка.**

### СВЯТЛАНА

У будні дзень застаць разам сям'ю складана. Анатоль працуе ў Бялыніцкім камунгасе, а Святлана — у раёнцы «Зара над Друццю». Ад Вішова да Бялыніч 20 хвілін язды, і гаспадыня сустракае мяне дома са сваім малодшым сынам Валерам. Сям'я жыве на адной з утульных вуліц аграгарадка. Ён знакаміты тым, што тут знаходзіцца цэнтральная сядзіба квітнеючага калгаса «Радзіма», якім кіруе вядомы на ўсю Беларусь Аляксандр Лапацентаў.

Лёс у Святланы пакручасты, шмат чаго прыйшлося перажыць за кароткі перыяд жыцця. Ёй быў усяго 21 год, калі яны з Мікалаем — яе першым мужам — пабраліся шлюбам. Яму наогул толькі 20 споўнілася. Святлана ўспамінае, як рамантычна яны сустрэліся. Сама яна родам з вёскі Васількі. Там жа, як потым аказалася, жыла і бабуля Мікалая. Лета ў той год было амаль такое ж спякотнае, як сёлета. Вечарам яна пайшла купацца на возера і ўбачыла, што на другім беразе малады хлопец плавае на вялікай надзьмутай шыне. Ён таксама звярнуў на яе ўвагу. Падплыў, пазнаёміліся, і, калі развіталіся, было шкадаванне. Хлопец сказаў, што служыць у арміі і прыехаў да бабулі на адпачынак. Святлане Мікалай спадабаўся, але чакаць яго не прапанаваў. Падумала, што ён зусім не падобны на таго Анатоля, за якога яе сватала сяброўка. Толік наогул ёй не прыйшоўся даспадобы. А за Мікалая, напэўна, і замуж пайшла б, калі б паклікаў. Але ён маўчаў. Не тое, што Святлана забылася пра сустрэчу, але вучоба, дамашнія справы зацягнулі. Пачуцці нагадалі пра сябе, калі яны зноў убачыліся ў Васільках. Ён запрасіў яе на дачу, яна пагадзілася, але не вельмі хацела ісці і здзівілася, калі ўбачыла ўсю яго сям'ю. Аказваецца, ён такім нестандартным спосабам вырашыў зрабіць ёй прапанову. На жаль, лёс падарыў ім толькі пайгода шчаслівага жыцця. Яна і цяпер стараецца не згадваць дзень, калі насустрач іх легкавушцы выехала на поўнай хуткасці смяротнае аўто. Мікалай быў за рулём і загінуў на месцы. А яе «хуткая» завезла ў рэанімацыю. Святлана была на шостым месяцы цяжарнасці. Наступствы аварыі далі пра сябе знаць: Кірыл нарадзіўся інвалідам. Ён прыгожы, вельмі падобны на бацьку, але рухаецца з цяжкасцю. Зараз ён студэнт МДУ імя Куляшова, будучы біёлаг-географ.



### АНАТОЛЬ

У Святланы былі ўсе шанцы застацца ў Магілёве, але яна паехала па размеркаванні працаваць у Вішоўскую бібліятэку. Нельга сказаць, што гэта яе ўзрадавала, толькі жыццё так моцна яе выпрабавала, што сіл змагацца з ім не было. Ад Вішова да любімых Васількоў — некалькі кіламетраў, але з Васількамі было скончана. З маці былі праблемы, а калі памерла бабуля, якая выхоўвала Святлану і яе старшую сястру, дом прадалі. На памяць яна толькі і паспела захапіць некалькі дарагіх сэрцу рэчаў. Сярод іх — дарэвалюцыйныя фота прадзеда, зухаватага марака, які, як расказвала бабуля, штурмаваў Зімні палац у Санкт-Пецярбургу падчас рэвалюцыі. Потым вярнуўся ў родныя мясціны і працаваў на рост тутэйшага калгаса.

Пра новае замужжа Святлана не думала. Ну каму патрэбна жанчына з дзіцем на руках, ды яшчэ інвалідам? Але, як той казаў, лёс на крывой кабыле не аб'едзеш. Сяброўка паклікала на свой дзень нараджэння і запрасіла таксама Анатоля, які Святлане некалькі гадоў таму не вельмі спадабаўся. На гэты раз яна ўбачыла яго іншымі вачыма. Ён, здавалася, вялікай цікавасці да маладой жанчыны не праяўляў, але пасля свята яны пачалі сустракацца. Праз тыдзень Анатоль прапанаваў жыць разам. Святлана паставіла ўмову: або ў загс, або «да пабачэння». Так, даволі прагматычна, яны сталі адной сям'ёй. Ёй — 27, яму — 30, самы падыходзячы ўзрост, каб скарыстацца магчымасцю паспрабаваць жыць з чыстай старонкі. А калі ў іх нарадзіўся Валера, жыццё, здаецца, нарэшце памяняла фарбы на больш радасныя. Яны і дом вось гэты купілі. Святлана сама выбірала, спадабалася месца. Тое, што стары, не бяда. У Анатоля рукі залатыя. Вунь і лазенку адбудаваў, печку на сучасны лад склаў, вышкі зрабіў, каб сена на зіму для Міры нарыхтаваць. Гаспадар, адным словам. У іх у двары і маленькі трактарок стаіць. Агарод не малы — 25 сотак. Трэба і ўзараць, і абагнаць. З братам дах перарабіў, зараз у сенцах прыгажосць наводзіць.

— І гэта яшчэ толькі пачатак нашых пераўтварэнняў, — радуецца Святлана.

### КАЛІ РАБОТА НЕ Ў ЦЯЖАР

Святлана бярэ кавуновыя скарынкі, і мы ідзём да загона, частаваць карміцельку:

— Міра, ідзі сюды, — кліча яна жывёлу, і тая паслухмяна спяшаецца насустрач.

Пад нагамі круціцца чарнавухая Ліза — дварняк, чымсьці падобны на спаніэля. Такія ж доўгія шаўкавістыя вушы. Яшчэ адзін сабака брэша на ланцугу. У Лізы шчаняты, і яна перыядычна паказвае мне свае дробныя зубы. Маўляў, глядзі, калі што... Насамрэч яна вельмі добрая: Мурзіка, які восенню кацянём прыблудзіўся да іх дома, узяла пад сваю апеку. Цікава, што ён такой жа расфарбоўкі — чорна-белай, як і ўсе астатнія жывёлы ў гэтым доме. Мурзік таксама знайшоў прымяненне ў гаспадарцы. Сёлета клубніцы ад птушак ахоўваў.

— Для мяне вёска — гэта цікавасць, жыццё, заўсёды нешта новае, — прызнаецца Святлана. — Цяпліцы ў нас кожную вясну стаяць па-іншаму, мы не можам прадказаць, якая культура ў нас вырасце, якое лета будзе. Кожны раз як у першы клас. З суседкамі падзяліліся, нешта новае вырасла. Кожны вечар хаджу кветкі нюхаць. Бывае, на рабоце стамлюся, дамоў прыйду, нічога не хочацца, а градкі супакойваюць. Паела суніц, і ўжо іншы настрой. Рэлаксацыя поўная. Зямля сілы дае ў прамым сэнсе. Мы робім усё з задавальненнем, таму і даглядаць гаспадарку няцяжка. Устаём а 6 гадзіне, я раблю перакус, муж ідзе даіць карову. На работу абодвум на восем. Вечарам а палове на шостую ўжо дома. Муж траўкі накосіць...

Гаспадыня запрашае ў хату і частуе блінамі з дамашнім маслам. Раніцай паспела збіць паміж справай. Спрабую і атрымліваю сапраўдную асалоду. Яго ні з якім магазінным не параўнаць. На заробак Святлана з Анатолем не скардзяцца — нават па гарадскіх мерках ня-дрэнны, але без каровы і агарода, прызнаюцца, было б цяжка. Яны і карову спецыяльна набылі, калі палічылі, колькі грошай ідзе на прадукты. Гэта зараз старэйшы вучыцца ва ўніверсітэце, а раней на сям'ю прыходзілася ў дзень купляць некалькі бутэлек малака, не лічачы масла, смятаны і ўсяго астатняга.

Агарод для Святланы не катарга, як для некаторых, а пляцоўка для творчасці. Тут у яе ўперамешку і кветкі, і садавіна з гароднінай. Зараз у паветры стаіць дурманны пах лілій. А восенню зацвітуць вяргіні. У Святланы іх кустоў 10. На градках спеюць бульба, буракі, капуста, цыбуля, морква, памідоры, цыбуля эксібішэн: цыбуліна да 600 грамаў вырастае! А клубніц сёлета было столькі, што частку нават атрымалася прадаць. Лішняя капейка сям'і не пашкодзіць. Дадатковы даход прыносіць сад. Яблыні, грушы, вішні — дрэў 20, плюс кусты.

— Закрутак шмат раблю, — тлумачыць Святлана. — У асноўным агуркі, памідоры і кампоты. Я іх закручваю, дарэчы, з 8 класа.

Пад вокнамі дома — невялічкая зона адпачынку з вінаграднікам, тут жа месца для мангала. А на пустым кавалачку зямлі сужэнцы збіраюцца сажалку зрабіць і туды карася запусціць.

### У ВЁСЦЫ НЕ ЗАСУМУЕШ

— Таму што няма калі, — смяецца суразмоўніца. — Летам на агародзе цэлы дзень. А зімой вяжу і кнігі чытаю. Бабуля навучыла вязаць дыванкі са старых рэчаў. Вельмі карысны занятак. А з нітак вяжу шкарпэткі, рукавіцы, шапкі, шалікі.

У доме багатая бібліятэка. Караткевіч — любімы пісьменнік Святланы. Яго «Каласы пад сярпом тваім» яна прачытала ў 9 класе і была ў захапленні. А ў кнізе «Васільковае поле Айчыны», якая прэзентавана на Дні пісьменства ў Бялынічах летась, ёсць аповед самой Святланы. І «Звязда» для яе не чужая. У 2014-м яе твор быў надрукаваны на старонках выдання і заняў 1-е месца ў конкурсе апавяданняў. Калі прыехала за прызам, усе былі ў шоку ад таго, што звычайны карэктар раённай газеты змагла такое напісаць. У конкурсе ўдзельнічалі пісьменнікі, якія па некалькі кніг ужо маюць. Яна на іх фоне была белай варонай. Яны нават не верылі, што ў яе, пачаткоўца, адразу так добра атрымалася.

— Я доўга пісала гэта апавяданне, месяцы два, правіла, шліфавала, — расказвае Святлана. — Вельмі люблю пісаць пра людзей, якія чымсьці займаюцца. Яшчэ адзін аповед пра Афганістан у «Полымі» надрукавалі. Там амаль усё праўда. Мужчына, калі мне гэта расказваў, плакаў. І я — разам з ім. Журналістыка дапамагае знайсці гісторыю, а з яе вырастае аповед або верш.

### ЛЮБОЎ ПРЫХОДЗІЦЬ ДА ЦЯРПЛІВЫХ

— Я ж пасля школы марыла толькі пра горад, думала, што ў вёсцы адны няўдачнікі ды невукі застаюцца, — прызнаецца Святлана. — Калі вярталася на радзіму, ехала, і ў грудзях ком сядзеў. Але жыццё часта мяняе нашы погляды. Зараз мяне ніякім абаранкам у горад не заваб іш. Я туды толькі па справах езджу. Тут мая сям'я, мой дом, мая гаспадарка. Нашы дзеці ведаюць, што малако ад каровы, а не з крамы. Калі малады, пра гэта не думаеш. Асабліва калі вакол усе падбухторваюць: едзь у горад, там сапраўднае жыццё! Раней думала толькі пра тое, каб зарабіць больш грошай. Цяпер жыву ў задавальненне, мне падабаецца работа, і вострай неабходнасці ў вялікіх грошах няма.

Святлана з Анатолем — вернікі, кожную нядзелю ходзяць у царкву. Прызнаюцца, што вера цалкам змяніла іх светапогляд, у тым ліку наконт вёскі. А прыйшлі яны туды выпадкова.

— У нашага пастара прозвішча таксама Магілеўчык, — успамінае Святлана. — Сяброўка, праз якую мы і пазнаёміліся з Анатолем, паехала ў Германію. Яна мне лісты слала, а іх памылкова насілі пастару. Аднойчы пастар з жонкай прынеслі лісты, і мы разгаварыліся. Пайшлі ў храм з цікавасці і хутка зразумелі, што без гэтых сустрэч жыць не можам. У нейкі момант адчулі, што павінны быць там. Мы з мужам усяго тыдзень былі знаёмыя да таго, як вырашылі жыць разам, потым маглі б развесціся разоў 300, але вера дала новыя сілы, памяняла самаацэнку. Зараз ёсць матывацыя, цікавасць. І кожны дзень прыносіць радасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**
*Бялыніцкі раён.*

## Закрытое акционерное общество «Альфа-Банк»

220013, Минск, ул. Сурганова, 43-47,
тел.: (017) 217-64-63, 217-64-59, факс (017) 200-59-29
Телекс 252190 ITIB BY, SWIFT ALFA BY 2X

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС по состоянию на 01.07.2021

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2021 | 2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 148 820 | 173 103 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 601 991 | 834 549 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 150 901 | 60 091 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 104 883 | 111 483 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 280 853 | 2 113 648 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 2 050 | 174 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 88 937 | 85 466 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 697 | 754 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 921 | 921 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 12 601 | 12 576 |
| **15** | **ИТОГО АКТИВЫ** | **11** | **3 392 654** | **3 392 765** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 36 886 | 20 000 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 190 003 | 113 299 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 2 438 098 | 2 485 705 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 102 290 | 211 112 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 6 180 | 7 740 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 50 864 | 43 487 |
| **24** | **Всего обязательства** | **120** | **2 824 321** | **2 881 343** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 70 419 | 101 369 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 100 000 | 74 807 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 41 522 | 41 674 |
| 30 | Накопленняа прибыль | 1215 | 356 392 | 293 572 |
| **31** | **Всего собственный капитал** | **121** | **568 333** | **511 422** |
| **32** | **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | **12** | **3 392 654** | **3 392 765** |

И.о. Председатель Правления С.З. Пархимович

Главный бухгалтер А.В. Скрипка

Дата подписания: 05 июля 2021 г.

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ по состоянию на 01.07.2021

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2021 | 2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 174 050 | 119 596 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 32 974 | 40 493 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | **141 076** | **79 103** |
| 4 | Комиссиионные доходы | 2021 | 71 630 | 51 194 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 10 061 | 8 785 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **61 569** | **42 409** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | -4 359 | 134 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 43 232 | 40 883 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 2 305 | 6 788 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 25 099 | 9 140 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6 905 | 5 328 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 96 559 | 77 458 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 7 542 | 6 768 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 121 528 | 81 279 |
| **16** | **Расход (доход) по налогу на прибыль** | **212** | **33 667** | **20 064** |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **87 861** | **61 215** |

И.о. Председатель Правления С.З. Пархимович

Главный бухгалтер А.В. Скрипка

Дата подписания: 05 июля 2021 г.

УНП 101541947

---

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Опять двадцать пять. 3 тур»

Сведения об Организаторе рекламной игры:

**Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг»**, УНП **690362737.**

Зарегистрировано **02.11.2005 № 961 Минским областным исполнительным комитетом.**

Местонахождение Организатора:

**223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, д. 7, административные помещения, кабинет № 24.**

Наименование рекламной игры: **«Опять двадцать пять. 3 тур».**

Рекламная игра зарегистрирована:

**Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры от 06.07.2021 за № 4032.**

Период проведения рекламной игры: **с 07.07.2021 по 19.07.2021 (включая период проведения розыгрыша, выдачи призов, опубликования результатов Рекламной игры).**

Количество участников Рекламной игры за весь период составило **1738 человек.**

Количество игровых номеров, участвующих в рекламной игре, составило **2026.**

Всего был проведено пять розыгрышей.

Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Победителем стали:

**1. Ящук Петр Николаевич, выигравший топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л, стоимостью 197,00 (сто девяносто семь рублей, 00 копеек).**

**2. Яцук Ирина Станиславовна, выигравшая топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л, стоимостью 197,00 (сто девяносто семь рублей, 00 копеек).**

**3. Ярошко Михаил Леонидович, выигравший топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л, стоимостью 197,00 (сто девяносто семь рублей, 00 копеек).**

**4. Колесникова Марина Викторовна, выигравшая топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л, стоимостью 197,00 (сто девяносто семь рублей, 00 копеек).**

**5. Самуйлик Олег Васильевич, выигравший топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л, стоимостью 197,00 (сто девяносто семь рублей, 00 копеек).**

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: **+375 17 233-33-33 с 10.00 до 18.00 в рабочие дни.**

Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» от 06.07.2021.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Купала-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ГАРАЖЕЙ

*(составные части и принадлежности: диспетчерская, здание диспетчерской, благоустройство, 2 забора),*
**общей площадью 289,7 кв. м, с инв. № 630/С-73604, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 623855700001000442 (право аренды по 25.09.2044) площадью 1,4135 га по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. п. Радошковичи, ул. 3 Липеня, 30.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона канала Вилейско-Минской водной системы пл. 1,4135 га, охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0130 га.*

**Начальная цена с НДС (20 %) – 80 040,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **8 004,00** бел. руб.).

На объекты отделом принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Минского областного исполнительного комитета наложен запрет на совершение регистрационных действий, который будет снят после перечисления денежных средств на депозитный счет ГУЮ Миноблисполкома.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию в СМИ.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **18.08.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.08.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8029) 856-80-04.**

УНП 690324015

---

ЗАО «ЦЕНТР ПРОМЫШЛЕННОЙ ОЦЕНКИ» ИНФОРМИРУЕТ

В извещение о проведении электронных торгов (04.08.2021)

## ПО ПРОДАЖЕ КОМПЛЕКТА МАТЕРИАЛОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА МАГАЗИНА,

принадлежащих Смолевичскому райпо, опубликованном в газете «Звязда» от 02.07.2021,
вносится изменение по составу – **состав лота читать как:**

| Наименование элементов деревянного изделия | Размеры, мм | Общая длина, п. м | Общий объем, куб. м |
|---|---|---|---|
| ОЦИЛИНДРОВАННАЯ ДРЕВЕСИНА | | | |
| Стеновая заготовка (h=2,7 м) Оцилиндрованная древесина с выбранным пазом и зарезанными чашками | d 220 | 680 | 25,849 |
| СТРОПИЛЬНАЯ СИСТЕМА КРЫШИ (площадь кровли 88 кв. м) | | | |
| Стропильные ноги (6,8 м) – 14 шт. | 80 х 200 | 95,2 | 1,523 |
| Стропильные ноги строганные (6,8 м) – 4 шт. | 75 х 200 | 27,2 | 0,408 |
| Стропильные ноги строганные (крыльцо) (2,3 м) – 1 шт. | 60 х 160 | - | 0,11 |
| Контробрешетка – бруски | 25 х 80 | 133,9 | 0,268 |
| Обрешетка (шаг 300) | 30 х 100 | 330 | 0,99 |
| ПРОЧИЕ МАТЕРИАЛЫ | | | |
| Подкладочный брус | 50 х 160 | 38 | 0,304 |
| Нагеля (бруски березовые) (330 мм) – 20 шт. | 23 х 23 | 6,6 | - |
| Бруски монтажные для проемов | 40 х 40 | 24 | 0,038 |

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. Сайт: www.ipmtorgi.by**

УНП 600048660

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, ул. Слуцкое шоссе, 26**

### ЗДАНИЕ МАГАЗИНА

(общ. пл. 268,9 кв. м, инв. № 600/С-171336, составные части и принадлежности: пристройка, сарай-пристройка, сарай).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1222** га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 25.01.2120) для строительства и обслуживания магазина. Ограничения (обременения) прав: природная территория, подлежащая специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения (3-й пояс-262, 267-268)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 722 865, 60 бел. руб.**

**Лот № 2**
**Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Молодежная, 12**

### АДМИНИСТРАТИВНОЕ ЗДАНИЕ

(общ. пл. 1079,3 кв. м, инв. № 630/С-54835).
***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,1244 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов административного назначения – для содержания и обслуживания административного здания.

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 1 095 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещения о проведении предыдущих аукционов опубликованы в газете «Звязда»: лот № 1 – 25.06.2021, лот № 2 – 15.06.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов 29.07.2021 в 10.00. Окончание торгов 29.07.2021 в 11.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.07.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовбытсервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ БЛОКА БЫТОВЫХ УСЛУГ

***(составные части и принадлежности: пристройка)*, инв. № 610/С-33337, общей площадью 155 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 640400000003000117 площадью 0,0200 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. III Интернационала, 56.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 137 700,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**13 770,00** бел. руб.). *(Цена снижена на 25 %).*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объекта, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, производится в следующем порядке: в течение 6 (шести) календарных месяцев с момента заключения договора купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда»: 26.06.2021.

Аукцион состоится **28.07.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.07.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (0177) 73-36-34, 8 (029) 184-53-35.**

УНП 600012016

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску** (Продавец)

**Лот № 1:**

## 1. АВТОМОБИЛЬ VOLKSWAGEN PASSAT, кузов (рама) № WVWZZZ3CZAP042455.

**Местонахождение:** г. Минск, пл. Свободы, 17.
**Начальная цена с НДС** – 12000,00 руб.
Аукцион состоится **19.08.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# 60 ХВІЛІН, КАБ КАНЧАТКОВА ВЫЗНАЧЫЦЦА З ПРАФЕСІЯЙ

## ГРАФІК ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ

**З 20 да 26 ліпеня** вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Для некаторых катэгорый абітурыентаў тэрміны падачы дакументаў крыху іншыя. Так, **з 20 да 28 ліпеня** (на два дні даўжэй) будуць прымаць дакументы на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю на дзённую форму навучання.

І ўсяго два дні (**з 20 да 22 ліпеня**) адведзена на прыём дакументаў ад выпускнікоў профільных педагагічных і аграрных класаў, якія паступаюць без здачы экзаменаў па сумоўі на педагагічныя спецыяльнасці і спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымаца:

**з 20 ліпеня да 5 жніўня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

**з 20 ліпеня да 10 жніўня** — на дзённую форму атрымання адукацыі па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях;

**з 20 ліпеня да 9 жніўня** — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Унутраныя ўступныя іспыты ў ВНУ па асобных спецыяльнасцях (спартыўныя, творчыя, інтэграваныя) пройдуць **з 27 ліпеня да 4 жніўня**. У Акадэміі МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, Ваеннай акадэміі, на ваенных факультэтах ВНУ унутраныя выпрабаванні пройдуць **з 27 да 29 ліпеня. З 29 ліпеня да 4 жніўня** будуць здаваць экзамены абітурыенты, якія паступаюць на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці.

Тэрміны залічэння абітурыентаў на месцы, устаноўленыя кантрольнымі лічбамі прыёму для атрымання вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту, наступныя:

**да 31 ліпеня** — у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, Інстытуце пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, на ваенных факультэтах ВНУ;

**да 6 жніўня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

**да 5 жніўня** — у іншых дзяржаўных ВНУ.

На платную форму навучання залічэнне ва ўсіх ВНУ — **да 11 жніўня.**

## КАБ НЕ ЗАСТАЦЦА ЗА БОРТАМ

Абітурыентам варта ведаць, што падаць арыгіналы дакументаў можна толькі ў адну ВНУ. Але ў рамках вызначанага для падачы дакументаў перыяду можна забіраць і перападаваць дакументы колькі заўгодна раз. У многіх ВНУ і на факультэтах ёсць агульны конкурс, які прадугледжвае падачу дакументаў адразу на некалькі спецыяльнасцяў аднаго кірунку.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Стандартны пакет дакументаў для прыёмнай камісіі — гэта дакумент аб адукацыі (атэстат або дыплом), пашпарт, сертыфікаты ЦТ, дакументы, якія пацвярджаюць ільготы, даведка аб стане здароўя, фатаграфіі 3 х 4. Заява запаўняецца альбо ў асабістым кабінеце на сайце ВНУ, альбо асабіста пры падачы дакументаў. Для асобных спецыяльнасцяў і форм навучання гэты спіс можа быць шырэйшы.

Як расказала **кансультант упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэма ГЕРЛОЎСКАЯ**, як і раней, назіраць за ходам падачы дакументаў можна будзе анлайн. Ёсць для абітурыентаў важная навіна: цяпер інфармацыя аб колькасці набраных балаў, заяўленых у прыёмную камісію, будзе прадстаўлена ў іншым дыяпазоне. Раней ён складаў 10 балаў, напрыклад, 301—310, 311—320 і гэтак далей. Цяпер дыяпазон звузіўся да пяці балаў. Так абітурыентам будзе прасцей ацаніць свае шанцы, бо пры залічэнні мае значэнне нават адзін бал.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Падаваць дакументы лепш у першыя дні, бо калі ахвотных цягнуць да апошняга акажацца шмат, то конкурсная сітуацыя можа рэзка змяніцца ўжо пасля закрыцця прыёмнай камісіі, і абітурыент мае ўсе шанцы застацца за бортам. А вось сітуацыю з падачай дакументаў і сваё месца ў абітурыенцкім рэйтынгу трэба маніторыць пастаянна: інфармацыя аб ходзе падачы дакументаў абнаўляецца кожныя тры гадзіны, а ў некаторых універсітэтах — у рэжыме рэальнага часу.

У папярэднія гады апошняе абнаўленне ў дзень закрыцця прыёмных камісій адбывалася ў 15 гадзін, і тры гадзіны невядомасці былі для абітурыентаў самымі напружанымі. Але сёлета апошняе абнаўленне адбудзецца ў 17 гадзін. Такім чынам, у абітурыентаў будзе яшчэ гадзіна, каб сарыентавацца і падаць дакументы туды, дзе ім гарантавана хопіць балаў.

## СПЕЦЫЯЛІСТЫ ПА ЭКАНАМІЧНАЙ БЯСПЕЦЫ

Між іншым, выбар у абітурыентаў вялікі: **50 ВНУ прапануюць увазе моладзі 340 спецыяльнасцяў.** У гэтым годзе ўпершыню пройдзе набор і на абсалютна новыя для нашай краіны спецыяльнасці.

Так, на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пачнуць рыхтаваць студэнтаў па новай спецыяльнасці **«Рэгіёназнаўства»**. Яе адкрыццё абумоўлена патрэбай айчынных арганізацый і кампаній у супрацоўніках, якія валодаюць комплекснымі ведамі аб палітычных, эканамічных, сацыяльных, экалагічных, канфесійных, этнічных і культурных адметнасцях пэўнага рэгіёна, краіны або групы дзяржаў. Спецыяльнасць арыентавана на міждысцыплінарнасць і ўключае фундаментальную падрыхтоўку па гуманітарных, эканамічных, палітычных, геаграфічных, юрыдычных навуках, вывучэнне на павышаным узроўні дзвюх замежных моў, адна з якіх — мова краіны рэгіёна, што вывучаецца. Студэнты будуць навучацца па спецыялізацыях **«Заходняя Еўропа і Паўночная Амерыка»**, **«Цэнтральная і Усходняя Еўропа»**, **«Блізкі Усход і Афрыка»**, **«Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён»** і **«Лацінская Амерыка»**.

Выпускнікі спецыяльнасці **«Рэгіёназнаўства»** змогуць працаваць аналітыкамі, прагназістамі, экспертамі па развіцці сацыякультурных, эканамічных ці палітычных сувязяў з рознымі рэгіёнамі і краінамі.

Яшчэ адна новая міждысцыплінарная спецыяльнасць — **«Эканамічная бяспека»** — інтэгравала найлепшыя айчынныя праграмы па эканоміцы, праве і інфармацыйных тэхналогіях у сферы бяспекі. Будучых спецыялістаў навучаць ацэньваць і прадухіляць магчымыя пагрозы і страты для прадпрыемстваў, маніторыць фактары, якія ўплываюць на іх эканамічную бяспеку, прагназаваць і кіраваць эканамічнымі рызыкамі. Выпускнікі змогуць свабодна арыентавацца ў адміністрацыйным, гаспадарчым, фінансавым і мытным праве.

## ІНАВАЦЫЙНАЯ ТЭХНІКА І ПРАМЫСЛОВЫ ДЫЗАЙН

— Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт — гэта горад у горадзе, — кажа **адказны сакратар прыёмнай камісіі ВНУ Андрэй САФОНАЎ.** — Мы плануем набраць каля 4400 абітурыентаў на 100 спецыяльнасцяў і спецыялізацый. Бюджэтныя месцы займаюць прыкладна 70 працэнтаў ад кантрольных лічбаў набору.

Вядучыя будаўнічыя прадпрыемствы маюць вострую патрэбу ў інжынерах, якія дасканала ведаюць інавацыйнае абсталяванне, што прымяняецца ва ўсім шматпрофільным будаўнічым комплексе. Менавіта таму ў БНТУ адкрыецца набор на спецыяльнасць **«Інавацыйная тэхніка для будаўнічага комплексу»**. Падрыхтоўка ў рамках спецыяльнасці будзе праводзіцца па трох спецыялізацыях: **«Інавацыйная тэхніка для будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог», «Ліфты, эскалатары, травалары і пад'ёмна-транспартныя машыны» і «Інавацыйнае абсталяванне для атрымання прадуктаў з адпрацаваных будаўнічых канструкцый».** Гэта значыць, што пасля другога курса сумеснай вучобы студэнты падзеляцца на тры ўмоўныя падгрупы, дзе ў кожнай будзе свой пералік дысцыплін.

Будучыя інжынеры атрымаюць навыкі аўтаматызаванага праектавання дэталяў, агрэгатаў і машын, а таксама будуць ведаць усё аб інавацыйным абсталяванні будаўнічага комплексу. Выпускнікі спецыяльнасці змогуць працаваць на прадпрыемствах будаўнічага комплексу, у буйных гандлёвых цэнтрах, вакзалах, метро, Нацыянальным аэрапорце ў якасці інжынераў па эксплуатацыі грузапад'ёмных механізмаў, ліфтаў, эскалатараў і на іншых аб'ектах.

Яшчэ адна новая цікавая спецыяльнасць — **«Прамысловы дызайн»** — з двума кірункамі: дызайн транспартных сродкаў і дызайн прамысловага абсталявання. Студэнтаў чакае паглыбленая падрыхтоўка ў галіне дызайн-праектавання транспартных сродкаў і вытворчага абсталявання. У працэсе падрыхтоўкі інжынерных кадраў увага будзе ўдзяляцца метадам і сродкам мастацкага канструявання, кампазіцыі, каларыстыцы, макетавання і трохмернага мадэлявання знешняй будовы, а таксама інтэр'еру кабін, працоўнага месца аператара і пасажырскага салона транспартных сродкаў. Падрыхтоўка інжынераў-дызайнераў будзе ажыццяўляцца для розных тэхнічных напрамкаў, звязаных з даследаваннем, праектаваннем і вытворчасцю аўтатрактарнай, будаўніча-дарожнай тэхнікі, сродкаў гарадскога транспарту, у тым ліку электрычнага і аўтаномнага, а таксама для навукова-даследчых, праектных арганізацый і дызайнерскіх бюро. Выпускнікі спецыяльнасці змогуць працаўладкавацца на вядучых прадпрыемствах ў галіне машынабудавання, сярод якіх ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў», Аб'яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ААТ «Мінскі трактарны завод» і іншыя.

Выпускнікі напрамку «Прамысловы дызайн вытворчага абсталявання» будуць запатрабаваныя на прадпрыемствах станкабудавання, прыборабудавання, бытавой тэхнікі, электратэхнічнай і радыёэлектроннай прамысловасці, вылічальнай тэхнікі, транспартнага машынабудавання і лёгкай прамысловасці. Іх чакаюць заняткі па асновах web-дызайну, распрацоўцы кампазіцый у прамысловым дызайне, засваенне спецыялізаваных праграмных прадуктаў для мадэлявання і візуалізацыі.

## ПІЛОТЫ ДЛЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АВІЯЦЫІ

А ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі сёлета адбудзецца першы набор на спецыяльнасць **«Лётная эксплуатацыя паветраных суднаў грамадзянскай авіяцыі»** з прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «Інжынер-пілот».

Гэта новая старонка ў гісторыі навучальнай установы. Пачынаючы з 1974 года тут рыхтавалі авіяцыйны персанал самага рознага профілю: інжынерна-тэхнічных спецыялістаў, якія займаюцца абслугоўваннем паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў, авіяцыйнага абсталявання, а таксама авіяцыйных дыспетчараў. Не хапала толькі аднаго, але вельмі важнага звяна — у краіне не вялася падрыхтоўка лётнага саставу для грамадзянскай авіяцыі. Цяпер гэты недахоп будзе ліквідаваны.

Але наборы будуць невялікія. Восем чалавек плануюць узяць на бюджэтную форму навучання і столькі ж — на платную. Для таго каб паступіць на новую спецыяльнасць, абітурыенты павінны будуць падаць у прыёмную камісію тры сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання: па беларускай ці рускай мове (на выбар), матэматыцы і англійскай мове.

Авіяцыя — гэта англамоўная галіна, і нават тэхнічную дакументацыю не дазваляецца перакладаць на рускую мову, таму ў будучых інжынераў-пілотаў павінен быць вельмі добры ўзровень валодання англійскай мовай (іншыя замежныя мовы не падыходзяць).

Акрамя ўступных іспытаў, абітурыенты павінны прайсці яшчэ і прафадбор. Ён уключае медыцынскі агляд ва ўрачэбна-лётнай экспертнай камісіі медыцынскай службы грамадзянскай авіяцыі, а таксама іспыты па фізічнай падрыхтоўцы на базе акадэміі.

Падрыхтоўка будучых пілотаў будзе ўключаць некалькі блокаў. Тэарэтычная падрыхтоўка плануецца на базе акадэміі. А трэнажорная і лётная падрыхтоўкі будуць весціся на базе авіяцыйных арганізацый, якія маюць адпаведную сертыфікацыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 23 (549)

# Знікне з душ чалавечых граніт...

**Пра паэта Паўла ПРУДНІКАВА сапраўды можна сказаць, што ён пражыў аднымі клопатамі са сваім XX стагоддзем, паспытаўшы ў роднай Беларусі, савецкай краіне рознага хлеба, розных выпрабаванняў. Нарадзіўся 14 ліпеня 1911 года, а пайшоў з жыцця 26 сакавіка 2000-га...**



Родам з Магілёўшчыны, з Клімавіцкага павета, ён рана пазнаў смак працы. З добра засвоенымі ўрокамі сялянскай нівы выправіўся шукаць сваю долю на Данбасе. Працаваў шахцёрам, металургам. Пасля — на будаўніцтве шаўковай фабрыкі ў Магілёве. Відаць, працоўная загартоўка зрабіла сваю справу, калі малады паэт выправіўся на вучобу ў Ленінград. У ім усё кіпела, бурліла. Акрамя вершаў, вабіла навука. Таленавітага маладога чалавека заўважыў такі аўтарытэт, як доктар філалагічных навук Канстанцін Аляксеевіч Пушкарэвіч (1890—1942), які працаваў у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце. Наш зямляк, сланімчанін нараджэннем, ён ведаў цану талентам. Дарэчы, да сваёй смерці Пушкарэвіч захоўваў архіў Бранiслава Эпімаха-Шыпілы, гэтага збіральніка і захавальніка беларускасці, чалавека, які шмат зрабіў на тое, каб развіць, выпеставаць талент народнага песняра Беларусі Янкі Купалы... Ён, Пушкарэвіч, настойліва параіў Паўлу Пруднікаву паступаць у аспірантуру Акадэміі навук. Ды задуманаму не дадзена было здзейсніцца. Маладога чалавека арыштавалі. Спярша ўтрымлівалі ў сумна славутых «Крыжах», затым выправілі па рашэнні суда ў высылку на доўгія гады...

ГУЛАГаўскія «школы» не прайшлі дарэмна. І ў плане здароўя, і пасля, напрыканцы 1940-х — у пачатку 1950-х — у плане вяртання да нармальнага жыцця. А самае галоўнае — не так лёгка было вярнуцца ў творчую прастору. Рэабілітаваны ў 1956 годзе, Павел Пруднікаў фактычна ў літаратуру пачаў вяртацца напрыканцы 1960-х гадоў. У 1968 годзе выйшаў яго другі зборнік (першы — у 1932-м) — «Час майго нараджэння». Паэту ўжо было пад шэсцьдзясят. І да 1968 года ён працаваў настаўнікам. Пераехаўшы ў Мінск, некаторы час папрацаваў у часопісе «Служба быту Беларусі». А з выхадам на пенсію ў 1971 годзе пачаў працаваць болей актыўна як паэт і празаік... Ды надышлі розныя хваробы. У апошнія гады жыцця зусім не мог запісваць сам, вершы дыктаваў родным, блізкім людзям.

*«Я стаміўся. Даруй мне, Радзіма, // Што выходжу з ігры ў такі час. // Коні смуты ў душы наслядзілі, // Закапыцілі шлях на Парнас. // Пыл і муць, хоць ты выкалі вока!.. // Не адолець мне іх ані як. // Сам сабе стаў чужым і далёкім — // Не гару, а капчу, як смаляк...»* Гэтыя радкі — ужо з 1990-х... У 1988 годзе выдаў кнігу ўспамінаў «Далёкае, але не забытае», на старонках якой расказаў пра свае сустрэчы з Янкам Купалам, Платонам Галавачом, Міхасём Чаротам, Якубам Коласам, іншымі пісьменнікамі, якія працавалі ў беларускай літаратуры ў часіны маладосці Паўла Пруднікава. У 1988 годзе часопіс «Полымя» надрукаваў паэму Паўла Пруднікава «Таймыр» — пра час сталінскіх рэпрэсій, пра ўласныя мытарствы паэта. А ў 1993 годзе выйшла кніга «За калючым дротам», якая аб'яднала аповесці «Яжовыя рукавіцы» — пра зняволенне ў «Крыжах» і «Пекла» — пра тэрмін зняволення ў Сібіры.

Вось ці не апошнія паэтычныя радкі Паўла Пруднікава, напісаныя ў 1995 годзе: *«Як хацелася многа сказаць // Мне пра ўсё, што ў душы набалела. // Боль і смутак, як ёсць, паказаць, // Не з аглядкай, а прама і смела. // Ды, на жаль, не сказаў усяго, // Што так доўга сціскала мне грудзі. // Шмат блукаў сярод мутных кругоў, // Загубіў час у плесені, брудзе. // Я шукаў дабрыні між людзей, // Чалавечае ласкі, спагады. // Не губляў і упартых надзей // Сваю справу давесці да ладу. // Ды скажу табе, шчыры чытач, // Што шукаў, не заўсёды знаходзіў. // Засталося нямала задач, // Але сілы мае на зыходзе. // Тое, што не ўдалося рашыць // Мне сягоння ў нялёгкім паходзе, // Пакідаю для іншай душы // Не ў бягучым — у новым стагоддзі. // Веру — прыйдзе пара дабрыні // І людской узаемнай спагады. // Знікне з душ чалавечых граніт, // Расцвітуць яны грушавым садам! // Недаверкамі нельга нам жыць // І цураца парадку зямнога. // Шчасце наша ў саміх нас ляжыць. // У адказе ж мы ўсе перад Богам».* Гучыць як запавет, як тастамент. І — як споведзь шчырага чалавека, шчырага творцы...

**Кастусь ХАДЫКА.**

У лабірынтах мастацтва

# ГУМЕН, «ГУМЯНОІДЫ» І ВІЦЕБСК

**У Мінску адкрылася выстава, прымеркаваная да 80-годдзя выдатнага майстра Феліска Фёдаравіча Гумена. Мінчане яго творчасці амаль не ведаюць (зрэшты, як і многіх рэгіянальных мастакоў), хоць у Віцебску яго імя знаёмае кожнаму.**



Гумен — мастак-легенда, які здольны стварыць за адзін дзень 5—10 акварэляў, а ў студэнцкія гады паставіў рэкорд: да 50! Некаторыя кажуць, прыходзячы на выставу: «Такіх фарбаў не бывае ў жыцці, гэта ўсё не з натуры напісана, гэта ўсё яго фантазіі». Але ад Гумена фатаграфічнасці мы і не чакаем, хоць працуе ён на пленэры.

Акварэлісты — асаблівая каста сярод мастакоў, яны заўсёды адчувалі сваю асобнасць і з 1995 года вылучыліся ў супольнасць «Віцебская акварэль». Гумен — лідар віцебскіх акварэлістаў, якія прызнаныя асаблівай школай, асаблівым эстэтычным феноменам. Ён нарадзіўся ў Амурскай вобласці ў пачатку вайны і быў апалены ёю (у літаральным значэнні гэтага слова — у тры гады атрымаў апёкавую траўму ад зарада «кацюшы»). У творцы намяшана шмат розных крывей: з аднаго боку — славацкая, з другога — украінская, руская. А дзяцінства яго прайшло ў гарнізонах: вандравалі з сям'ёй па ўсім СССР. Гумен лічыць, што яркі колер яго акварэляў ідзе ад шчаслівага дзяцінства ў Сярэдняй Азіі, дзе і ў вайну было шмат садавіны, шмат святла і сонца. Бацька пасля дэмабілізацыі асеў у Ваўкавыску, дзе Фелікс скончыў сярэднюю школу.

Яго шлях у мастацтва — ланцуг «невыпадковых выпадковасцяў». У 1948 годзе ў Мінску ў Оперным тэатры адкрылася мастацкае вучылішча. Па прыкладзе свайго сябра Гуліна вырашыў паступаць. Усе селі пісаць пастановачны нацюрморт. Фелікс умеў маляваць — танкі, коней, як усе дзеці. Але вось нацюрморт напісаць алеем яшчэ не спрабаваў. Аднагодкі сталі смяяцца, сказалі, ідзі змый, нармальна намалюй, ты не паступіш з такім.



Ён выйшаў з класа, паклаў палатно пад ваду, і гэты паўзмыты малюнак прынёс і паставіў на мальберт. Прыйшоў мастак Лейтман, які прымаў экзамен, сам вядомы эксперыментатар, убачыў яго эцюд і паставіў у прыклад: якi прыгожы эфект, каларыстычна вытрыманая работа. І нечакана для сябе Гумен паступіў. Але праз некалькі месяцаў дырэктар вучылішча абвясціў, што ў Віцебску арганізоўваецца педагагічны інстытут, там не пяць гадоў тэрмін навучання, а чатыры і можна адразу атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі. З 1958 года пачынаецца віцебская эпапея Гумена, які са сталіцы трапіў у абсалютна разбураны горад. Але ацалеў старадаўні выдатны будынак, які неўзабаве атрымаў назву «Віцебскі мастграф». Там выкладаў акадэмічны мастак Іван Сталяроў. І вось тут пачаўся мастак Гумен як акварэліст.

Калі ў яго пыталіся, чаму ён стаў менавіта акварэлістам, ён тлумачыў гэта жыццёвымі абставінамі. На першым курсе адразу ж ажаніўся, далі пакой у інтэрнаце плошчай 8 метраў, нарадзілася дзіця, жонка не пераносіла пах алейнай фарбы, і немагчыма было з-за цеснаты паставіць мальберт. І ён вырашыў, што акварэль экалагічна чысты матэрыял і што ён будзе займацца акварэллю.

Кажа аб акварэлі як аб жывой істоце: «Яна жывая, рухомая. Яна як жанчына, з ёй трэба далікатна, многае сабе не дазваляць. Яна як кошка: не трывае дрэсуры». Нават дыпломную працу ён рабіў у тэхніцы акварэлі, што было да гэтага строга забаронена: толькі жывапіс! І зноў — выпадак: старшынёй дзяржаўнай камісіі быў у той год мінскі мастак Казлоўскі, які нядаўна прыехаў з Парыжа і, натхнёны вольным духам Францыі, дазволіў такі дыплом.

Гумен са студэнцкіх гадоў адкрыў для сябе Віцебск як горад мастакоў, горад Шагала, Малевіча, «беларускі Таледа», як назваў яго Рэпін. Ён ахвотна пісаў на вуліцы. Гэта як прадстаўленне, перформанс. Неяк сказаў, што ў кожнага карабля свой порт, і для яго такі прычал — Віцебск. Віцебск у яго разнастайны, часта рамантычны. Вельмі цяжка пісаць поўню, святло ў вокнах. У Гумена нараджаецца свая манера: заліванне па мокрым, белае месца выбіраецца спецыяльным лязом. Асабліва мастака прыцягвае зімовы Віцебск. Ён ператварае яго ў казку. Расплываюцца абрысы цэркваў, мякка растае снег.

Вельмі прыгожыя яго нацюрморты. Ён любіць пісаць празрыстасці: шкло, бутлі, шклянкі. Тыя, хто займаўся акварэллю, ведаюць, як складана знайсці гэтыя найтанчэйшыя суадносіны колеру. Гумен выкарыстоўвае тэхніку залівання. Асабліва любіць кветкавыя нацюрморты. Ён можа спалучаць раскошныя садовыя півоні і дзьмухаўцы, сарваныя пры дарозе. Заўсёды выклікае захапленне серыя «Летнія букеты». Пры нашым колеравым голадзе такія выставы карысныя нават арт-тэрапеўтычна.

Гумен кожны летні дзень пачынае з напісання кветкавага нацюрморта. Здзіўляе і нечаканымі сюжэтамі ў духу фламандскіх кухонных нацюрмортаў, як, напрыклад, «Фарш з бараніны». Для Гумена не існуе «нізкай» натуры, згадаць хоць бы нацюрморт «Курыца і фарш» у спалучэнні з апельсінамі. Успамінаецца Суцін, які таксама любіў пісаць тушкі куранят.

Частка экспазіцыі прысвечана эксперыментам. Напрыклад, выказвае асацыяцыі ў музыцы сродкамі акварэлі. Часам спрабуе перадаць пачуцці, эмоцыі праз фарбы: здзіўленне, надзея, азарэнне. Калі б абстракцыі Гумена выкарыстала наша тэкстыльная прамысловасць, то гэта былі б цудоўныя па дэкоры тканіны.

«Гумяноіды» — асобная тэма, гэта вучні Гумена. Так іх жартам празвалі на мастграфе за вернасць настаўніку. Выкладчыкам ён быў нетрадыцыйным: не стаяў над кожным вучнем, не правіў акварэлі, ён проста падыходзіў і казаў: «Паглядзі, як я гэта пішу». Методыка ў яго была інтуітыўная. І «гумяноідаў» сфарміравалася ў Гумена за гады выкладання досыць вялікая колькасць, каля 150 (на курсе ў яго вучылася па 12 чалавек штогод). Многія вядомыя сваімі графічнымі работамі.

Адзін з журналістаў назваў свой артыкул «Віцебск у аблозе Гумена». Мастака просяць пісаць на вуліцах падчас правядзення «Славянскага базару» — гэта прываблівае турыстаў. Усе бібліятэкі Віцебска любяць выставы Гумена. Ён піша партрэты бібліятэкараў і дорыць ім партрэты. Адна акцёрка Віцебскага тэатра, маладая мама, у яе было двое маленькіх дзяцей, захварэла. Пухліна мозгу. «Яна віцябчанка, я яе ведаю, я бываў на яе спектаклях, я павінен ёй чым магу дапамагчы», — сказаў мастак. І цэлая выстава работ Гумена была прададзеная, а грошы пайшлі на дапамогу гэтай жанчыне, яна акрыяла. Таму мы можам сказаць, што Гумен сапраўдны народны мастак Віцебска.

У Гётэборгу, у Швецыі, ёсць Музей акварэлі. У краінах Скандынавіі наогул вельмі шануецца акварэльная тэхніка. На востраве сярод цудоўных халодных вод пабудаваны невялікі ангарчык у стылі IKEA. Туды прыязджаюць мастакі, жывуць і працуюць, штодня бачаць праз шкляныя сцены выдатны водны пейзаж.

Мастак і мастацтвазнаўца Уладзімір Рынкевіч, вучань Гумена, вырашыў падхапіць гэтую ідэю і такі ж музей зрабіць у Беларусі. Ён знайшоў такую сядзібу — дом памешчыка Глазко на беразе возера Расоны за 43 км ад Полацка. Рынкевіча падтрымалі мясцовыя ўлады. І, ведома, першая выстава ў новым музеі была Фелікса Гумена.

**Надзея УСАВА, вядучы навуковы спецыяліст Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.**

Барацьбіты

# «Не цурайся роднай мовы. Адстойвай нацыянальнасць беларуса!»

## Так казаў бацька Валянціну Таўлаю — вядомаму заходнебеларускаму паэту, які ў свой час працаваў і ў газеце «Звязда»

**Калі вядомы заходнебеларускі паэт Валянцін Таўлай вучыўся ў Слонімскай настаўніцкай семінарыі (было гэта пры польскім часе), аднойчы да іх у клас зайшоў элегантны настаўнік, які замест таго, каб чытаць лекцыю, пачаў дапытваць юнакоў і дзяўчат. Яго цікавіла нацыянальнасць, веравызнанне і, галоўнае, на якой мове кожны размаўляе ў сям'і. Усе семінарысты, хоць былі сярод іх і беларусы, казалі пра сваё польскае паходжанне і каталіцкае веравызнанне. Не ўзнімаючы вачэй, настаўнік пачаў задаваць шаблонныя пытанні і яму, будучаму пісьменніку. «Нацыянальнасць?» — «Беларуская», — сціпла адказвае Таўлай. Настаўнік паўтарае пытанне, атрымлівае той жа адказ. «Ёсць такая нацыянальнасць? — нервова ўдакладняе паляк. — Дзе яна жыве? У Амерыцы?» — «У Беларусі», — не перастае здзіўляць Таўлай. «Родная мова ў сям'і?» — наступае настаўнік. — «Беларуская». — «Няма такой мовы!» — не супакойваецца паляк. — «Відаць, ёсць, калі гаворым...»**

«Бой» скончыўся, але «цяжкая артылерыя» была наперадзе: спачатку Валянціна Таўлая пазбавілі стыпендыі і перасталі бясплатна карміць, а потым увогуле адлічылі з семінарыі. Яго лёс, як і многіх дзеячаў нацыянальнага адраджэння ў Заходняй Беларусі, быў няпросты. Каб даведацца, што давялося перажыць сапраўднаму беларусу, карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў Доме Валянціна Таўлая, які з'яўляецца аб'ектам Лідскага гісторыка-мастацкага музея. Сімвалічна, што ў гэтым будынку пісьменнік жыў з 1939 да 1941 года.

### Бабуля замяніла маці

Нарадзіўся Валянцін Таўлай 8 лютага 1914 года ў Баранавічах. Ён быў старэйшым за сваіх братоў. Сям'я жыла літаральна на колах: бацька-чыгуначнік часта мяняў месца працы. Дзеці былі яшчэ малыя, калі маці, Марыя Антонаўна, памерла ад халеры. Гадавала іх бацькава маці — бабуля Аўдоцця. Вось як характарызаваў яе Валянцін Таўлай: «Гэта звычайная вясковая жанчына. Даволі доўгае знаходжанне ў гарадах не адбівалася ні ў яе мове, ні на вопратцы, ні на звычаях і абыходжанні. Зусім непісьменная. Бясконца працавітая і цярплівая. Невычарпальная крыніца народных казак...»

Калі Таўлаі пераехалі ў родную вёску бацькі, што недалёка ад Зэльвы, Павел Дзям'янавіч падаўся ў Ліду шукаць працу. Валянцін, бабуля і двухгадовы брат Саша засталіся ў вёсцы. Жыццё пры паляках было нялёгкае. «Гадаваліся на крапіве, рэдкай зацірцы, — успамінае Таўлай. — Мы адраджалі гаспадарку на 3,5 дзесяціны спадчыннай зямлі. Бацька прысылаў зароблены грошы, каб пакрысе будавацца. І гэта клалася зноў-такі на бабчыны плечы...»

### Бацька-рэвалюцыянер

Неўзабаве Павел Дзям'янавіч забраў старэйшага сына ў Ліду вучыцца. Ішоў 1921 год. Валянцін Таўлай пайшоў у першы клас польскай школы. Яму было няпроста: незразумелая мова, аднакласнікі насміхаліся з яго беларускага паходжання, называлі «кацапам». Аўтарытэт падрос, калі Таўлай стаў пісаць. Свой першы верш «Wrybelki» («Верабейкі») ён напісаў на польскай мове ў сем гадоў. Чытаў яго перад усім класам. Настаўніца, патрапаўшы яго па шчацэ, сказала: «Добра, пішы! Можа, некалі будзеш сапраўдным паэтам».


Паэт падчас працы ў газеце «Звязда», 1932 год.

І ён стаў. Толькі перш колькі ўсяго давялося перажыць! Асабліва «ўскладняла» жыццё хлопцу яго беларускае паходжанне, на якое ўвесь час указвалі палякі. Але Таўлай ніколі не здрадзіў сабе. Як і яго бацька, якога ў 1924 годзе скарацілі з працы з-за таго, што ён не паляк. Павел Дзям'янавіч і дагэтуль быў рашуча настроены супраць усяго польскага, але гэта стала апошняй кропкай. Ён пачынае гуртаваць вакол сябе сялян, якія мараць аб нацыянальным адраджэнні. У вёсцы Вялікая Кракотка, што на Слонімшчыне, старэйшы Таўлай арганізоўвае беларускую школу, дзе вучыцца і Валянцін, стварае гурток «Грамада», куды ўваходзяць беларусы, не згодныя з палітыкай паланізацыі. Збіраючыся ў хаце Таўлаяў, аднадумцы абмяркоўваюць, што ім рабіць на ніве нацыянальнага адраджэння, чытаюць беларускія газеты. Мова гучыць толькі родная.

### Сярод аднадумцаў

Уся рэвалюцыйная дзейнасць перадалася Валянціну Таўлаю ад бацькі, які заўсёды казаў яму: «Сынок, не цурайся роднай мовы. Адстойвай нацыянальнасць беларуса!» Ён, дарэчы, ажаніўся другі раз. Мачаха-настаўніца, Сцепаніда Паўлаўна Дарашкевіч, рыхтавала Валянціна да паступлення ў Слонімскую настаўніцкую семінарыю. Паступіў, але правучыўся нядоўга: барацьбіты за беларускае самавызначэнне польскай уладзе былі не патрэбны.

Валянцін моцна перажываў, як можа з'явіцца дамоў пасля таго, як цэлы год адвучыўся. Але, на яго здзіўленне, бацька не сварыўся, бо разумеў, у чым справа. Зіму паэт прасядзеў дома. Мачаха з ім штодзённа займалася, таму Таўлай з лёгкасцю паступае ў Беларускую гімназію ў Вільні. Там ён хутка знаходзіць сваіх аднадумцаў. Змагары за нацыянальную і сацыяльную незалежнасць выпускаюць газету, ствараюць тэматычныя лістоўкі, наведваюць вязняў турмы ў Лукішках, вывешваюць нацыянальны сцяг на савецкія святы. Актыўна ўдзельнічае ў палітычнай барацьбе і Таўлай.

Пасля зімовых канікулаў на другім курсе пісьменніка адлічылі. Паколькі ён быў непаўналетнім, з Вільні ў родную вёску яго даставілі пад канвоем паліцыі. Вакол Валянціна гуртуецца вясковая моладзь. Яго дзейнасць не застаецца незаўважанай: за ім увесь час сочаць. Аднойчы Таўлай вырашае трапіць у Савецкі Саюз. Зімовай ноччу пераходзіць чыгунку ў раёне Маладзечна. Пісьменніка затрымліваюць на польскім баку і садзяць у турму.

### «Выбіць з рук аловак і паперу...»

Пазнейшая спроба пераходу граніцы была больш удалай. У Мінску Валянцін Таўлай паступае на літфак БДУ. Паралельна супрацоўнічае з Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі, з'яўляецца членам Беларускага аб'яднання пралетарскіх пісьменнікаў, працуе літаратурным рэдактарам легальнага рэвалюцыйнага органа «Беларуская газета». А ў пачатку 1930-х гадоў ён — літаратурны супрацоўнік газеты «Звязда», дзе актыўна друкуе свае вершы.

— У снежні 1933 года ў Вільні Валянцін Таўлай арганізаваў і правёў першую канферэнцыю рэвалюцыйных пісьменнікаў Заходняй Беларусі, а таксама падрыхтаваў да друку першы рэвалюцыйны часопіс «Літаратурная старонка», — расказвае **навуковы супрацоўнік Лідскага гісторыка-мастацкага музея Алесь ХІТРУН**. — Падчас спробы вяртання ў Беларусь каля Радашковічаў яго разам з сябрам Якубам Міско арыштавалі. У студзені 1934 года пасадзілі ў турму ў Лукішках. Там ён знаёміцца з Максімам Танкам, разам выпускаюць рукапісны часопіс «Краты». Пракурор казаў у судзе пра Таўлая як пра самага таленавітага і небяспечнага крамольніка: «Мы павінны выбіць з рук гэтых людзей аловак і паперу, пазбавіць іх магчымасці пісаць і бунтаваць...» Далі яму 8 гадоў турмы, але пачалася Другая сусветная вайна.

Таўлай вяртаецца ў Мінск. Неўзабаве яго зноў накіроўваюць у Заходнюю Беларусь для падпольнай работы. Паэта павінны былі сустрэць у Гродне, але той спазніўся на цягнік. Калі ж прыехаў пазней, адчуў, што за ім сочаць. Тады Валянцін вырашае адправіцца назад у Мінск. У вагоне з ім едуць і гэтыя людзі. Таўлай разумеў, што яго арыштуюць, таму, пад'язджаючы да Зэльвы, выскачыў праз маленькае акенца (цягнік ехаў на поўным ходзе!). Дахаты яму ісці было нельга: дзе, як ні тут, яго будуць шукаць. Тую зімовую ноч ён пераначаваў на магіле ў маці.


Валянцін Таўлай з жонкай Лідзіяй Казлоўскай.

Аднак праз некаторы час Таўлая зноў арыштавалі. Яго кінулі ў Гродзенскую турму. Падчас прагулак паэт незаўважна падымаў каменьчыкі, якімі на падлозе ў камеры пісаў вершы. Зняволеныя, якія выходзілі на свабоду, ведаючы іх на памяць, расказвалі сваім знаёмым — вершы распаўсюджваліся імгненна, таму выйшаў на волю Таўлай ужо вядомым паэтам.

Калі пачалося вызваленне Заходняй Беларусі, Таўлай яшчэ адбываў зняволенне. Як расказваюць сведкі, Гродна чырвонаармейцы бралі вельмі цяжка. Калі вызвалілі вязняў, Валянцін разам з некаторымі аднадумцамі дамоў не пабег. Знайшлі прафсаюзны камітэт, атрымалі там абмундзіраванне і зброю, пачалі выступаць супраць палякаў. Калі да апошніх падышло падмацаванне, учарашніх вязняў зноў пасадзілі ў турму. Па ўспамінах пісьменніка, у тую ноч ніхто не спаў. Усе чакалі, што вось-вось расчыняцца дзверы і іх выведуць на расстрэл. Але своечасова вярнуліся савецкія войскі...

### Бацька паэта загінуў у «Асвенціме»

Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР Валянцін вярнуўся ў Ліду, дзе жыла яго сям'я. За гэты час у старэйшага Таўлая нарадзілася дачка — Ніна, сястра пісьменніка, сёння жыве ў Вільнюсе. У верасні 1939 года ў Лідзе ствараецца раённая газета «Уперад» (цяпер «Лідская газета»), і Валянцін Таўлай з'яўляецца адным з яе першых супрацоўнікаў. У ім працягвае жыць рэвалюцыянер: ходзіць па прадпрыемствах, прапагандуе савецкія лозунгі, вядзе актыўную палітычную работу. Са сваёй першай жонкай Кірай Брант яны пасяляюцца ў гэтым доме, дзе цяпер знаходзіцца дом-музей. Але шчасце доўжыцца нядоўга — пачынаецца Вялікая Айчынная вайна.

З пачаткам нямецкай акупацыі Валянцін Таўлай пераязджае ў Навагрудак, дзе ўладкоўваецца памочнікам пісара ў гміну. Ён працуе на немцаў. Але гэта толькі прыкрыццё: выкарыстоўваючы сваю пасаду, паэт дапамагае беларусам.

— З малых гадоў да яго, як да магніту, цягнуліся людзі, — расказвае **навуковы супрацоўнік Лідскага гісторыка-мастацкага музея Настасся КАЛАДЗЯЖНАЯ**. — Ён не быў ганарлівым, мог знайсці агульную мову з любым, людзі ішлі да яго па параду, бо Валянцін мог дапамагчы, падтрымаць у цяжкую хвіліну. Нават падчас адбору людзей на прымусовыя работы ў Германію папярэджваў сем'і, каб яны маглі ўцячы. Калі ж мясцовым жыхарам патрэбна было вырашыць канкрэтнае пытанне, без боязі звярталіся да немцаў. А калі актыўна пачаў распаўсюджвацца партызанскі рух, падпольна дапамагаў народным мсціўцам: ён са сваёй другой жонкай Лідзіяй Казлоўскай былі сувязнымі двух партызанскіх атрадаў — імя Катоўскага і «Буравеснік».

Яны пажаніліся ў снежні 1942 года. Лідзія была руская, перад вайной, будучы студэнткай Ленінградскага кінематаграфічнага інстытута, аказалася ў Беларусі. Акурат пачалася вайна. У Ленінград дарогі няма, добра, што перад паездкай адвезла дзяцей да сваіх бацькоў. Паколькі вярнуцца дахаты Лідзія не змагла, нанялася працаваць да сялян. Было гэта акурат на Навагрудчыне, дзе працаваў Таўлай.

Людзі бачылі, што Валянцін часта ходзіць у лес, але яго настолькі паважалі, што ніхто не выдаў. Гітлераўцы так ніколі і не даведаліся, што чалавек, якому яны давяралі, таемна выносіў дакументы, забяспечваў важнай інфармацыяй партызан і нават друкаваўся ў агітплакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну».

Валянціна Таўлая схапілі, калі ён пасля вяртання з Вільні спыніўся ў Лідзе ў родных. Нехта выдаў, што бацька Таўлая таксама супрацоўнічае з партызанамі, нават забяспечвае іх падробнымі пашпартамі. Усіх траіх — бацьку, мачыху і Валянціна — арыштавалі і кінулі ў фашысцкую турму. Бацьку з жонкай адправілі ў Мінск. Мяркуецца, што яны загінулі ў лагеры смерці «Асвенцім». Малодшаму Таўлаю пашчасціла больш: дзякуючы жонцы, якая звярнулася па дапамогу да кіраўніка Навагрудскай самадапамогі, яго адпусцілі.

### Сувязь з Купалам

Пасля вызвалення Валянцін Таўлай працаваў у навагрудскай газеце «Звязда». Пасля смерці Янкі Купалы пераехаў у Мінск, уладкаваўся ў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, быў першым памагатым у цёткі Уладзі. З песняром маладога пісьменніка звязвала многае.

— У сакавіку 1940 года Янку Купалу абралі кандыдатам у дэпутаты па Лідска-Слабадскай акрузе, — расказвае даследчык творчасці Таўлая Алесь Хітрун. — Каб падзякаваць мясцовым жыхарам, класік беларускай літаратуры прыехаў у наш горад, дзе гасцяваў тры дні. Да яго прыезду ў Ліду меў дачыненне і Таўлай. Гэта было сапраўднае свята паэзіі на нашай зямлі! Сустрэліся сябры-паэты. Дагэтуль ва ўспамінах некаторых пісьменнікаў захавалася, як шчодра частаваў іх пясняр.

Цікавы факт. У Лідскай бібліятэцы, куды падчас свайго візіту ў горад завітаў Янка Купала, увогуле не было беларускіх кніг. Толькі на рускай і на яўрэйскай мовах. Пісьменнік паглядзеў, што бібліятэка ў бедным стане і падарыў сваю кнігу «Над ракой Арэсай». Так тут з'явілася першая кніга на роднай мове. Купала абяцаў даслаць яшчэ і стрымаў сваё слова.

Пасля вайны ў Валянціна Таўлая нарадзілася доўгачаканая дачушка Галінка — менавіта так ён яе называў. Але нацешыцца малой не паспеў. У яго былі праблемы з сэрцам. Сапраўдны беларус, яркі дзеяч нацыянальнага вызваленчага руху пайшоў з жыцця вельмі рана. Яму было ўсяго 33 гады...

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва Лідскага гісторыка-мастацкага музея.**


Даследчык творчасці паэта Алесь ХІТРУН у мемарыяльным пакоі Дома Таўлая ў Лідзе.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинский льнозавод» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** главный производственный корпус общей площадью 3765,8 кв. м, инв. № 611/С-32645, расположенный на земельном участке площадью 1,5960 га с кадастровым номером 620450100001003603 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 1.

Начальная цена с НДС (20 %) – **385 819,20 бел. руб**. Задаток 5 % от начальной цены (**19 290,00 бел. руб.**).

**Лот № 2:** административно-бытовой корпус общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **176 633,73 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**8 831,00 бел. руб.**).

**Лот № 3:** склад-арочник общей площадью 772 кв. м, инв. № 611/С-32657, расположенный на земельном участке площадью 0,1541 га с кадастровым номером 620450100001003594 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 4.

Начальная цена с НДС (20 %) – **85 006,80 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**4 250,00 бел. руб.**).

**Лот № 4:** склад-арочник общей площадью 651,7 кв. м, инв. № 611/С-32658, расположенный на земельном участке площадью 0,1659 га с кадастровым номером 620450100001003595 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 3.

Начальная цена с НДС (20 %) – **66 198,60 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**3 309,00 бел. руб.**).

**Лот № 5:** здание котельной общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655 и кастросборник, общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **117 784,80 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**5 889,00 бел. руб.)**.

**Лот № 6:** автовесовая общей площадью 193,2 кв. м, инв. № 611/С-32800, расположенная на земельном участке площадью 0,0435 га с кадастровым номером 620450100001003598 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 10.

Начальная цена с НДС (20 %) – **28 706,40 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**1 435,00 бел. руб.**).

**Лот № 7:** блок вспомогательных помещений общей площадью 515,2 кв. м, инв. № 611/С-32646, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **44 010,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**2 200,00 бел. руб.**).

**Лот 8 №:** навесной склад общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **55 701,00 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**2 785,00 бел. руб.**).

**Лот № 9:** насосная станция 2-го подъема общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **33 895,80 бел. руб**. Задаток 5 % от начальной цены (**1 694,00 бел. руб.**).

**Лот № 10:** шоха № 1 общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2, общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653 и подвальное помещение, общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенные по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **286 237,80 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**14 311,00 бел. руб.**).

**Стоимость лотов снижена на 55 %.**

**Задатки перечисляются на р/с** № **BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») 07.09.2017, 07.12.2017 и «Звязда» от 23.04.2018, 19.12.2018, 12.03.2019, 05.09.2019, 17.12.2019, 03.04.2020, 12.08.2020, 02.12.2020.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **18.08.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.08.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17.**

УНП 690657149

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ: КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ с инвентарным номером 122/С-14549 (наименование: общежитие; назначение: здания общежития),**
площадью 95,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Гойшика, д. 33, на земельном участке с кадастровым номером 123450100001003706, площадью 0,1909 га (доля в праве аренды – 37/100), составные части и принадлежности: две холодные пристройки

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 15 923,63 | Размер задатка, руб. | 1 592,36 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Ивацевичдрев», УНП 100325912, тел./ф 80164535634. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Шаг аукциона:** 15 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 19 августа 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 18 августа 2021 г. до 17.00**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «ВИСТАН» 210627, г. Витебск, ул. Димитрова, 36/7, тел.: 8 (0212) 608605, 8 (0212) 60-85-95.

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-190273, площадью 300,5 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23-3. Расположено на 1-м, 2-м этажах.

**Нач. цена:** 57000,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 5700,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 03.08.2021 в 11.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 19.07.2021 с 08.30 по 02.08.2021 до 17.30. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000002000413 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36 (право аренды). Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 21.01.2021, 06.05.2021, 02.06.2021.

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**. **Условия аукциона:** Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения торгов: возместить расходы по подготовке документации в сумме 483,93 бел. руб. с НДС на р/с, указанный в протоколе торгов, и затраты на организацию и проведение торгов; заключить договор купли-продажи в течение 15 рабочих дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет торгов в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. **Аукцион проводится** в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 378-57-36, +375 (212) 60-85-95 – Титок Оксана Михайловна.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ: ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ с инвентарным номером 150/D-11593 (наименование: ремонтно-механические мастерские; назначение: помещение транспортного назначения),**
**площадью 669,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Линейная, 23-2.**

Составные части и принадлежности: пристройка, забор железобетонный из ажурных плит, забор железобетонный из ажурных плит, забор из железобетонных плит, ворота металлические, асфальтобетонное покрытие, бетонные открытые площадки, бетонные открытые площадки, бетонные открытые площадки

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 266 969,06 | Размер задатка, руб. | 26 696,91 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** УП «Лунинецкая ПМК-19», 225644, Брестская обл., г. Лунинец, ул. Линейная, 23, УНП 200106234, тел./ф 801647 61948. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 18 августа 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 17 августа 2021 г. до 17.00**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/6534)

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

## ОАО «УПРАВЛЯЮЩАЯ КОМПАНИЯ ХОЛДИНГА «ГРОДНООБЛСЕЛЬХОЗТЕХНИКА»

| Предмет торгов | Начальная цена с учетом НДС, руб. | Сумма задатка (1 %), руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1 – свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2008 г. в., зав. № 2310060, рег. № СК-4 2832 | 106 205, 80 | 1 062,00 |
| **Лот № 2 – свеклоуборочный комбайн HOLMER Terra Dos T2,** 2005 г. в., зав. № 192805, рег. № б/н | 228 976,74 | 2 290,00 |
| **Лот № 3 – свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2006 г. в., зав. № 2210049, рег. № СК-4 2824 | 62 520,00 | 625,00 |
| **Лот № 4 – свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2007 г. в., зав. № 2310082, рег. № СК-4 2810 | 62 520,00 | 625,00 |

**Местонахождение имущества:** Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Рожанка (ОАО «Щучинский ремонтный завод»)

**Сведения о продавце:** ОАО «Управляющая компания холдинга «Гроднооблсельхозтехника», г. Гродно, ул. Лермонтова, 2, тел. 8 (0152) 626024

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906

**Торги состоятся 28 июля 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| Срок подачи документов для участия в торгах | По 22 июля 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8 |
|---|---|

Аукцион без условий. Шаг аукциона 5 %. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней с момента проведения аукциона.

**Условия оплаты:** 100 % предоплата. Условия участия и порядок проведения аукциона по тел. 8 (0152) 621632 и на сайте **www.fincentr.by.**

Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00, ответственное лицо:

Болдовский Алексей Геннадьевич, тел. в г. Гродно: 8 (0152) 626020, 626024. Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 16.06.2021 г.

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **переулок Боровой 2-й, 13** и земельный участок | 140100000001023226 | 0,1024 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **89 965,14** | 17 900,00 | **2 809,32** | 0,0001 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0011 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,1024 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях | газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |

| | |
|---|---|
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220, и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | **2 900,00 руб.** |
| **Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92 | **Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 11.08.2021 г.** |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

<u>- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);</u>

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 17 августа 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 16.07.2021 г. до 17.00 11.08.2021 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.**
**Контактный телефон 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

# ЭКІПАЖЫ, ЯКІЯ АДЛЯЦЕЛІ Ў ВЕЧНАСЦЬ...

## Пошукі працягваюцца

**Мне прыйшоў ліст ад расійскага пошукавіка з горада Зарайска Маскоўскай вобласці Сяргея Пятрухіна. Ён паведамляў, што па просьбе Ніны Дзмітрыеўны Бяловай шукае месца гібелі яе бацькі, Дзмітрыя Іванавіча Бялова, 1909 г. н., які загінуў у першыя дні вайны ў Беларусі. Паводле яе расповеду, 24 чэрвеня 1941 года ў адным самалёце з яе бацькам Дзмітрыем Бяловым ляцеў яго камандзір — Іван Іванавіч Пудак. У раёне Клецка пры трапленні нямецкага снарада ў самалёт Пудак даў каманду ўсім пакінуць паветранае судна. Калі выскокваў сам, то бачыў, што хтосьці ўжо пакідае палаючы самалёт. Але хто гэта быў, дакладна сказаць не мог.**

Вечарам Іван Пудак дабраўся да найбліжэйшага сяла, дзе мясцовыя жыхары далі яму жаночую вопратку, дзякуючы чаму ён праз два тыдні дайшоў да свайго аэрадрома, сустрэўся з жонкай Бялова і распавёў пра гэты паветраны бой. Разам з Бяловым і Пудаком у гэтым бai ўдзельнічаў і камандзір звяна 98-га ДБАП (далёкабамбардзіровачнага авіяпалка) Георгій Якаўлевіч Гарачкін (быў ён з імі ў адным экіпажы ці не — невядома). Гарачкін таксама быў збіты, выскачыў на парашуце, атрымаў раненне ў ступню, але выйшаў да сваіх. І пасля лячэння працягваў ваяваць.

Збіраемся групай і выязджаем у раён Клецка, па ўжо вядомай шашы пад назвай Варшаўка. У пошуках інфармацыі метадычна аб'язджаем усе найбліжэйшыя населеныя пункты.

### ВЁСКА ГРЫЦЭВІЧЫ

У музей школы в. Грыцэвічы, утвораны ў 1984 годзе, мяне ласкава запрасілі дырэктар школы Наталля Аляксандраўна Аўдзей і экскурсавод музея Валянціна Леанідаўна Гвозд. У музеі захоўваюцца фатаграфія і імя лётчыка з 98-га ДБАП малодшага лейтэнанта Мікалая Міхайлавіча Харчанкі, 1918 г. н., ураджэнца Украіны, які загінуў тут 24.06.1941 г. Другім яго таварышам, які загінуў на тэрыторыі раёна, з'яўляецца стралок-радыст малодшы сяржант Дзмітрый Вітальевіч Белікаў, 1919 г. н., з Казані. Выратавацца тады ўдалося толькі штурману, лейтэнанту Паўлу Кавальскаму.

### ВЁСКА ЦАПРА

Гэты паветраны бой адбыўся над вёскай Бабаевічы, а падбіты самалёт дацягнуў да Цапры. Алена Васілеўна Цісневіч добра памятала той дзень: «Тады жылі небагата, таму правіянт для сям'і нарыхтоўвалі самі. Мы якраз збіраліся ісці малоць муку да суседа, у яго жорны стаялі. І тут людзі пачалі крычаць: «Зачыняйце дзверы! Самалёт ляціць!»... Алена Васілеўна бачыла, як з самалёта падаў лётчык, у якога не раскрыўся парашут. Проста з парога паказала нам невялікі хмызняк, дзе скончылася зямное жыццё лейтэнанта Аляксея Леўчанкі. А праз пару дзясяткаў метраў — на мясцовых могілках — упаў і сам самалёт... Упаў пасярэдзіне, скасавурыўшы бярозы... «Калі я падбегла, лётчык ляжаў прама каля дарогі. Мой бацька падабраў яго цела, а таксама абвугленыя целы яшчэ двух лётчыкаў і з дапамогай іншых мужчын загарнуў усіх трох у адзін парашут і пахаваў. А дакументы лётчыка Леўчанкі захаваў парторг калгаса таварыш Каганскі. І потым, пасля вайны, перадаў у ваенкамат і напісаў у газету. Так знайшліся яго сваякі». Алена Васілеўна дадае: «Мы так пасябравалі са сваякамі лётчыка, што з часам сталі як родныя». Шмат гадоў жонка Леўчанкі, Вера Рыгораўна, дачка Рыма Аляксееўна і ўнучка Міра Валер'еўна з г. Бранска прыязджалі да Цісневічаў у госці, наведвалі магілку свайго бацькі і мужа і нават усе разам ездзілі ў Брэсцкую крэпасць.

Прозвішчы астатніх членаў экіпажа, на жаль, засталіся нявызначанымі. Не дажыла да выхаду гэтага артыкула і сама Алена Васілеўна. Час няўмольны...



Алена Васілеўна ЦІСНЕВІЧ
і яе памочніца Святлана Міхайлаўна СУБОТА.

### ВЁСКА ЗАЕЛЬНЯ

Пераязджаем на другі бок Варшаўкі.

Яшчэ ў Грыцэвіцкай школе нам параілі звярнуцца да мясцовага энтузіяста, неабыякавага чалавека з Заельні, які хварэе душой за сваю малую радзіму, — Валерыя Іванавіча Кірыка. Ён і стаў нашым далейшым гідам. Валерый Іванавіч чуў пра самалёты шмат. «Старыя распавядалі, што збітых савецкіх самалётаў у адзін дзень каля нас было тры. (А чацвёрты ў Цапры назаўтра збілі.) Адзін упаў у нас, у Заельні, недалёка ад могілак. Другі — у вёсцы Мервіны, а трэці — дзесьці за вёскай Нагорнае, каля Лубянецкіх хутароў. Гэтыя хутары даўно знеслі і зямлю зааралі». Валерый Іванавіч таксама паказаў стагадовы дуб, пад якім расстрэльвалі мірных жыхароў, а таксама нашых ваеннапалонных, якія знаходзіліся тут за калючым дротам і прыходзілі пад канвоем у вёску — па ваду. Працавалі яны тут жа — па ўкладцы бетоннай паласы ваеннага нямецкага аэрадрома. Палонныя цішком праносілі цвікі, а мясцовыя жанчыны давалі ім узамен ежу... І бедаваў Валерый Іванавіч, што нідзе не згадваецца пра гэты лагер. Як потым склаўся лёс салдат? Нікому не вядома...

Валерый Іванавіч вядзе нас да сведкі падзення самалётаў у тым далёкім-блізкім 1941-м... Іван Сандрозд яшчэ хлапчуком бегаў з сябрамі на месца падзення. Успамінае, як яны збіралі асколкі шкла і падпальвалі іх... Дзятве падабалася, як яны шыпяць і іскрацца.



Штурман Дзмітрый Іванавіч Бялоў.



Лётчык Мікалай Міхайлавіч Харчанка.



Лейтэнант Аляксей Дзмітрыевіч Леўчанка.

«Гэта тут, недалёка, метраў сто пяцьдзясят — вунь у той даліне», — паказвае ён. З самалёта ў в. Заельня ніякіх дакументаў і імёнаў знайсці не ўдалося... Але гэта было адно звяно з лётчыкам Харчанкам, які загінуў у Мервінах.

### ВЁСКА МЕРВІНЫ

Там нам таксама пашанцавала. Спагадлівыя людзі знаходзяцца ўсюды.

Валянцін Васілевіч Хмялеўскі — былы старшыня сельсавета. «Расказвалі, што паветраны бой ішоў над вёскай Мервіны. Наш самалёт быў збіты. Лётчык спрабаваў выскачыць, але беспаспяхова, ён разбіўся... Абломкі самалёта валяліся злева ад дарогі, у кар'еры, як ехаць на вёску Рубеж. Дакументы забралі немцы. Але мясцовы жыхар паспеў схаваць фатаграфію лётчыка».

Цёзка па прозвішчы нашага суразмоўніка — Уладзімір Фёдаравіч Хмялеўскі — дастае з хлява вялікую пасудзіну чырвана-ватна-меднага колеру. І наглядна дэманструе, што людзі рабілі потым з абломкаў самалёта і як гэта прымянялася ў побыце... «Быў я зусім маленькі на той час, многае памятаю толькі паводле расповеду старэйшых. Казалі, што загінулых закруцілі ў парашут і пахавалі пад дубам. Пасля вайны двух лётчыкаў перапахавалі ў Грыцэвічах. Па фота, надрукаваным у газеце, сваякі апазналі лётчыка Мікалая Харчанку». Па словах вяскоўцаў, яшчэ адзін самалёт упаў дзесьці каля вёскі Нагорнае, пад Іспасам — так называлі поле, дзе па традыцыі перад вялікой збіраліся ўсёй вёскай жыхары, выносілі сталы і святкавалі свята Спас. Вось туды і ўпаў самалёт.

### ВЁСКА РУБЕЖ

Лен-Ждан — такім незвычайным імем называюць Вячаслава Георгіевіча Жданко мясцовыя. Аказалася, што гэта ад назвы яго фірмы «ЛенжданЕўратранс». Ён расказаў: «Лётчык, паранены ў нагу, хаваўся ў доме маёй бабулі і мамы, на хутары вёскі Рубеж, якую падзяляе на дзве часткі рака Лань. Вось на гэты прыбярэжны хутар у дом Жданко і пракраўся паранены. Ён прыйшоў, калі ў хаце нікога не было. А немцы ў гэты час заўзята абшуквалі ўсё ў акрузе. Гаспадары, вярнуўшыся, знайшлі параненага ў нагу лётчыка ў шафе. Яго перапранулі, ён пражыў у іх некалькі дзён. Затым паказалі дарогу, і лётчык пайшоў, пакінуўшы свой парашут, з якога дзяўчаты потым шылі сабе сукенкі»...

Дапоўніла аповед цётка Вячаслава Георгіевіча, Гвозд (у дзявоцтве Рудко) Тацццяна Дзмітрыеўна, якая была дзіцем, але памятае, што самалётаў, збітых каля вёскі Рубеж, налічылі аж цэлых тры!.. І «ляглі» яны фактычна побач адзін з адным з інтэрвалам 50—70 метраў: адзін — каля моста, другі — ва ўрочышчы Кашары, трэці — на краі поля, каля самай дарогі. Парашуты лёталі ў небе як матылі. «І ў гэты ж час у нас у доме пачаў пражываць нейкі савецкі салдат. Звалі яго Рыгорый, Грыша... Так ён назваўся». (Параненага ў нагу лётчыка Гарачкіна звалі Георгій. Імёны па гучанні падобныя.) А яшчэ памятае Тацццяна Дзмітрыеўна, як ужо пасля вайны яе дзед Карней Ермалаевіч Марчук са сваёй нявесткай Лідзіяй Міхайлаўнай Рудко спілавалі ў лесе на патрэбы будаўніцтва дуб, на галінцы якога вісеў абрывак ад адзення лётчыка з кішэняй зялёнага, ахоўнага колеру. Знайшлі ў той кішэні нейкую трубачку, у якой ляжала фатаграфія сястры і маці лётчыка. «Памятаю як цяпер: жанчыны былі ў белых кофтах з русымі валасамі. І адрас пазначаны: г. Смаленск». Пасля вайны яе бацька напісаў ліст на гэты адрас і адправіў фота. Адказу, праўда, не прыйшло...

Такім чынам, самалётаў налічвалася ўжо шэсць: у в. Заельня, у в. Мервіны, пад «Іспасам», або па-іншаму паблізу хутара Лубянец; тры самалёты — у полі, насупраць хутароў в. Рубеж.

* * *

...З кнігі маршала авіяцыі М. С. Скрыпко, які камандаваў на той момант 98-м ДБАП, 52-й ДБАД, аэрадрома Шаталава ў Смаленскай вобласці: «У 18 гадзін 40 хвілін вылецела апошняя эскадрылля... у складзе 9 самалётаў для бамбардзіроўкі аўтакалон з войскамі ў раёне Картуз-Бярозы. Пры падыходзе да цэлі яна была перахоплена вялікай групай знішчальнікаў праціўніка. У выніку няроўнага паветранага бою з пераўзыходзячымі сіламі ворага эскадрылля страціла 8 самалётаў Іл-4. Толькі адзін самалёт вярнуўся на свой аэрадром. Гэтыя цяжкія страты яшчэ раз пацвердзілі неабходнасць суправаджэння бамбардзіроўшчыкаў знішчальнікамі. Але прыкрыцця не было».

З-за вялікіх страт, панесеных у першыя дні вайны, 98-ы ДБАП быў расфарміраваны ў жніўні 1941-га. І большасць яго дакументаў, як і паэкіпажныя спісы лётчыкаў, да гэтага дня, на жаль, не знойдзена. Таму мы не спыняем пошукі месца гібелі лётчыка Дзмітрыя Бялова, які загінуў у першыя дні вайны ў Беларусі. Тое-сёе праясняецца, кола звужаецца. Працяг будзе...

**Ларыса КАРАСІНА.**

Наш пазаштатны аўтар Ларыса Карасіна закончыла Беларускую акадэмію мастацтваў. Актрыса, рэжысёр. Яна, акрамя таго, яшчэ і пошукавік. У свабодны ад асноўнай работы час займаецца гістарычнымі расследаваннямі, архіўнымі матэрыяламі. Вядзе пошукі самалётаў і актыўна ўдзельнічае ў аднаўленні імён тых, хто без вестак прапаў у часы Вялікай Айчыннай.

Знайшла і аднавіла імёны савецкіх лётчыкаў, якія загінулі 27 чэрвеня 1941 года ў раёне г. Бабруйска, каля в. Падарэссе Старадарожскага раёна, вяла пошукавую работу па невядомым экіпажы, які загінуў побач з вёскамі Аступішча і Ліпнікі Слуцкага раёна, а таксама па экіпажы, які згарэў паблізу в. Бярозаўка Слуцкага раёна, працягвае працаваць па экіпажах, што прапалі ў Капыльскім і Клецкім раёнах. Адзін з галоўных дэвізаў — «Не забывай сваіх бацькоў!»

# АСКЕПКІ ВОСТРАВА

## Што адбываецца на Гаіці?



**Падзеі на Гаіці шакіравалі ўвесь свет. На мінулым тыдні прэзідэнта гэтай астраўной краіны Жавенэля Маіза застрэлілі ў яго ўласным доме ў прыгарадзе сталіцы Порт-а-Прэнс, цяжка паранілі жонку кіраўніка дзяржавы. Мяркуючы па відэа з месца падзей, тут адбылася сапраўдная бойня. Сцены дома як сіта прабіты кулямі. На целе 53-гадовага Маіза налічылі 12 агнястрэльных раненняў. Паводле даных гаіцянскіх улад, напад здзейсніла добра ўзброеная і арганізаваная група, у якую ўваходзілі 26 адстаўных калумбійскіх ваенных і два амерыканцы гаіцянскага паходжання. 23 з іх, у тым ліку абодва амерыканцы, затрыманы. Адразу пасля нападу паведамлялася, што злачынцы размаўлялі адзін з адным на англійскай і іспанскай мовах (Гаіці — франкамоўная краіна). «Замежнікі прыйшлі ў нашу краіну, каб забіць прэзідэнта», — заявіў кіраўнік гаіцянскай паліцыі Леон Шарль на прэс-канферэнцыі, дзе журналістам прадэманстравалі арыштаваных і адабраную ў іх зброю. Што ж адбываецца на Гаіці?**

### УЛАДНЫ ТРОХКУТНІК

Згодна з гаіцянскай канстытуцыяй, у выпадку гібелі, недзеяздольнасці або адстаўкі прэзідэнта часова выконваць яго абавязкі павінен старшыня Вярхоўнага суда, але ён нядаўна памёр ад каранавіруса. Наступны ў чарзе — прэм'ер-міністр. Як паведаміла «Бі-бі-сі», Маіз з 2018 года змяняў іх шэсць разоў і за дзень да забойства прызначыў сёмага, Арыэля Анры. Аднак ён не паспеў прыняць прысягу, а папярэдні прэм'ер, Клод Жазеф, яго паўнамоцтваў не прызнае. Анры, якога апазіцыя лічыць больш прыдатным для ролі прэм'ера, сказаў гаіцянскай газеце Le Nouvelliste, што ён больш не лічыць Жазефа законным прэм'ер-міністрам, і яму варта вярнуцца да ролі міністра замежных спраў. «Я думаю, нам трэба пагаварыць. Клод павінен быў застацца ва ўрадзе, які я збіраўся ствараць», — сказаў Анры.

Па паведамленні Agence France-Presse, Жазеф заявіў аб прыняцці на сябе паўнамоцтваў па кіраванні дзяржавай адразу пасля таго, як стала вядома аб жорсткім забойстве прэзідэнта. Пазней ён абвясціў, што на падставе канстытуцыі ўзначаліў надзвычайны Савет міністраў з пашыранымі паўнамоцтвамі, які на сваім пасяджэнні прыняў рашэнне аб увядзенні ў краіне надзвычайнага становішча. Адначасова сенат Гаіці абвясціў часовым прэзідэнтам свайго старшыню Жазефа Ламбера, які сцвярджае, што Вашынгтон падтрымлівае менавіта яго. Атрымаўся такі «уладны трохкутнік». Спецыяльны пасланнік ААН у Гаіці Пол Фармер заявіў, што выканаўца абавязкаў прэм'ер-міністра Клод Жазеф застанецца лідарам краіны да правядзення выбараў. Пра гэта паведаміла Reuters. Фармер таксама заклікаў бакі, якія прызнаюць і аспрэчваюць легітымнасць яго ўлады, адкласці рознагалоссі.

У той жа час стала вядома, што ЗША адхілілі просьбу ўрада Гаіці даслаць войскі для аховы аб'ектаў інфраструктуры, але накіравалі на востраў прадстаўнікоў Дзярждэпартамента, ФБР і Савета нацыянальнай бяспекі. Прадстаўнічая дэлегацыя прыбыла на востраў, каб ацаніць сітуацыю і правесці перагаворы з трыма асобамі, кожная з якіх лічыць сябе законным лідарам краіны. Таксама стала вядома, што амерыканская адміністрацыя накіравала ў Гаіці спецыялістаў з Міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША для дапамогі ўладам краіны ва ўмацаванні бяспекі крытычна важнай інфраструктуры. Пра гэта заявіў кіраўнік прэсслужбы Дзярждэпартамента Нэд Прайс.



### ЗВЫКЛАЯ СПРАВА

Журналіст тэлеканала Sky News Сцюарт Рэмзі па гарачых слядах патэлефанаваў сваім гаіцянскім знаёмым. Яны ў адзін голас сцвярджалі, што ўсё да таго і ішло, а галоўныя ўзрушэнні наперадзе. «Гэта зацішша перад бурай», — сказаў адзін з іх аб цяперашняй даволі спакойнай абстаноўцы ў краіне. «Гэта маглі быць бандыты, але яны звычайна не бываюць так добра арганізаваныя. Гэта маглі быць палітыкі, але ўпэўненасці няма», — сказаў другі суразмоўца Рэмзі. У гаіцянскіх сацсетках распаўсюджваюцца заклікі да пратэстаў супраць праўлення Жазефа.

Буйны крымінальны аўтарытэт Джымі Чэрызье па мянушцы Барбекю абвінаваціў у гібелі Маіза «смярдзючую буржуазію» і заявіў, што яго людзі выйдуць на вуліцы, каб не дазволіць ёй захапіць уладу. Каго ён падтрымлівае, Чэрызье не ўдакладніў.

Перавароты на Гаіці — звыклая справа, але ў такіх выпадках лідар змоўшчыкаў звычайна адразу з'яўляецца на тэлеэкранах і выступае з заявай. На гэты раз такога не здарылася. Апошняя нядаўная спроба мела месца не далей, як у лютым гэтага года. Былі арыштаваныя 23 чалавекі, у тым ліку член Вярхоўнага суда Гаіці і высокі паліцэйскі чын. Яны сцвярджалі, што гэта быў не путч, а дзеянні, накіраваныя на аднаўленне канстытуцыйнага ладу, паколькі тэрмін паўнамоцтваў Маіза, на іх думку, скончыўся 7 лютага. Прэзідэнт настойваў, што павінен пакінуць сваю пасаду годам пазней. Спрэчка паўстала з-за таго, што ў першы год пасля выбараў Маіз не мог прыступіць да прэзідэнцкіх абавязкаў з-за шматлікіх абвінавачванняў у фальсіфікацыі вынікаў галасавання. Апазіцыя абвясціла адстаўнога члена Вярхоўнага суда Жазефа Жан-Луі часовым прэзідэнтам, а далейшае праўленне Маіза неканстытуцыйным. Узровень падтрымкі кіраўніка дзяржавы апошнім часам рэзка ўпаў з-за эканамічных цяжкасцяў, карупцыі і разгулу бандытызму. Зрэшты, надзвычай нізкай была і яўка на выбарах 2017 года, якія прывялі яго да ўлады.

У кастрычніку 2019-га скончыўся тэрмін паўнамоцтваў гаіцянскага парламента. Паколькі дэпутаты не паспелі да гэтага часу прыняць новы закон аб выбарах, Маіз адклаў іх на два гады і пачаў кіраваць пры дапамозе дэкрэтаў. Да апошніх крывавых падзей ён ужо перажыў адзін замах. У кастрычніку 2018-га ў Маіза стралялі, ён застаўся жывы, але загінулі трое ахоўнікаў. У лютым і сакавіку гэтага года ў Гаіці прайшлі масавыя акцыі пратэсту супраць прапанаваных кіраўніком дзяржавы паправак да канстытуцыі. Ён хацеў скасаваць пасаду прэм'ер-міністра і верхнюю палату парламента, а таксама павялічыць тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта з чатырох да пяці гадоў і дазволіць яму абірацца на два тэрміны запар (цяпер паміж імі павінен быць перапынак). Дэманстранты блакіравалі вуліцы вогнішчамі з аўтапакрышак і смецця. Паліцыя выкарыстоўвала гумовыя кулі.

### ДВА ДОЛАРЫ Ў ДЗЕНЬ

Паводле інфармацыі «Бі-бі-сі», 60 працэнтаў дзесяцімільённага насельніцтва Гаіці жыве менш чым на два долары ў дзень. Журналіст Sky News, які пабываў там некалькі месяцаў таму, убачыў, што пасля разбуральнага землятрусу 2010-га сталіца па-ранейшаму выглядае як поле бітвы. Не адноўлены нават прэзідэнцкі палац, з-за чаго Маіз жыў не ў афіцыйнай рэзідэнцыі, а ў сваім доме.

Словы «банда» , «выкраданне» і «карупцыя» трывала замацаваліся ў лексіконе гаіцянцаў. Маіз запэўніваў, што прысвяціць свой апошні год ва ўладзе падрыхтоўцы дэмакратычных выбараў. Апаненты называлі яго безадказным і некампетэнтным лідарам і падазравалі ў намеры застацца ва ўладзе і пасля 2022 года.

Акцыі пратэсту рознага маштабу, якія звычайна завяршаюцца сутычкамі з паліцыяй, апошнія тры гады адбываліся ў гарадах краіны ледзь не штодня. У лютым 2020-га на вуліцах сталіцы з'явіліся барыкады, а паліцэйскія, якія патрабавалі паляпшэння ўмоў службы, атакавалі армейскі штаб. Супраць Маіза аб'ядналіся палітыкі, суддзі, праваабаронцы і рэлігійныя групы. На яго баку да канца заставалася камандаванне ўзброеных сіл.

Стратэгічнае становішча Гаіці амерыканцы неаднойчы параўноўвалі са становішчам Мальты і Гібралтара, адзначае topwar.ru. Гэта першая зручная гавань на выхадзе з Панамскага канала праз Карыбскае мора ў Атлантыку і апошняя — на ўваходзе з Атлантыкі праз Карыбскае мора ў Панамскі канал. Зразумела, што ЗША імкнуліся трымаць Гаіці пад поўным кантролем.

Але, як кажуць, «штосьці пайшло не так». Незадоўга да сваёй гібелі Жавенэль Маіз ушчэнт пасварыўся з амерыканскімі ўладамі, заўважыла ria.ru. Вашынгтон патрабаваў ад яго хутчэй сысці з пасады. Пасля лютаўска-сакавіцкіх падзей напал вулічных пратэстаў некалькі знізіўся. Збольшага гэтаму паспрыяла і пандэмія COVID-19. «Прыкметнае паслабленне рэакцыі грамадства на заклікі да масавых пратэстаў паказвае, што народ Гаіці стаміўся ад бясконцых лакдаўнаў і сваркі з-за ўлады», — заявіў у сувязі з гэтым прадстаўнік Дзярждэпартамента ЗША. Магчыма, гэта і падштурхнула невядомых пакуль ворагаў Маіза да рашучых дзеянняў.

### КАЛАМУТНАЯ ГІСТОРЫЯ

Судмедэксперты правялі ўскрыццё цела Жавенэля Маіза, паведамляе мясцовая газета Nouvelliste. Аб гэтым сказаў выданню міністр па справах галасавання і міжпартыйных адносін Гаіці Матыяс П'ер. Пасля судова-медыцынскай працэдуры былі распаўсюджаны фатаграфіі і рэнтгенаўскія здымкі цела. На адным з рэнтгенаўскіх здымкаў відаць, што ў грудной клетцы Маіза затрымаліся некалькі куль. На рэнтгенаграме чэрапа бачны пералом паміж лобнай і цемянной косткай — гэта падобна на кантрольны стрэл, які быў зроблены, калі прэзідэнт ужо ляжаў на спіне. На апублікаваным відэа з камер назірання чуваць, як узброеныя людзі ў чорным прадстаўляюцца супрацоўнікамі агенцтва ЗША па барацьбе з абаротам наркотыкаў і загадваюць усім легчы на падлогу.

Дзеці прэзідэнта пасля яго забойства былі дастаўлены ў бяспечнае месца, заявіў Клод Жазеф. Цяжка параненую жонку прэзідэнта вывезлі ў Маямі ў спробе выратаваць ёй жыццё. Паведамляецца, што ўрачы змаглі стабілізаваць яе стан. Клод Жазеф сказаў у інтэрв'ю «Бі-бі-сі», што прэзідэнта маглі застрэліць, паколькі ён «змагаўся з некаторымі алігархамі». «Мы не ведаем, ці ёсць сувязь паміж гэтымі алігархамі і замежнымі наймітамі», — сказаў часовы кіраўнік дзяржавы. Ён таксама заявіў, што прэзідэнта Гаіці катавалі перад смерцю. Аб чым менавіта імкнуліся даведацца арганізатары забойства, пакуль невядома.

Вядомы расійскі палітолаг Яўген Сатаноўскі ў сваім тэлеграм-канале пракаментаваў забойства прэзідэнта Гаіці. Паводле яго слоў, забойства прэзідэнта паказала, што ЗША не выконваюць міжнароднае права. «Ну, вось і прыйшла яснасць з Гаіці. Амерыканцы там прэзідэнта забілі», — напісаў эксперт. Ён адзначыў, што так і невядома, хто і чаму выдаў ордэр на арышт кіраўніка дзяржавы, аб якім расказалі на допыце затрыманыя.

Тым часам стала вядома, што быў затрыманы 63-гадовы грамадзянін ЗША гаіцянскага паходжання Крысціян Эмануэль Саньён. Ён, як лічаць гаіцянскія праваахоўнікі, наняў кілераў, якія забілі прэзідэнта Жавенэля Маіза. Паводле даных газеты Miami Herald, набор наймітаў ажыццяўляўся праз ахоўную фірму CTU Security, якая базіруецца ў Маямі і належыць выхадцу з Венесуэлы Антонія Інтрыяга. Крыніцы, блізкія да следства, расказалі СМІ, што арыштаваныя калумбійцы сцвярджаюць, быццам іх вербавалі на Гаіці для работы ахоўнікамі, у тым ліку ў прэзідэнта. Па іх словах, яны нібыта хацелі не забіць, а толькі арыштаваць Маіза, але, уварваўшыся на вілу, знайшлі яго ўжо мёртвым.

Пацвердзілася сувязь амерыканскага антынаркатычнага ведамства DEA з меркаванымі забойцамі прэзідэнта Гаіці. Адзін з падазраваных аказаўся інфарматарам агенцтва. Пра гэта ў DEA паведамілі РІА «Навіны». Новы маштаб гэтай справе надаюць паведамленні з Венесуэлы. Ахоўная кампанія CTU Security таксама магла быць датычная да замаху на Нікаласа Мадура. Такую інфармацыю абвясціў спікер Нацыянальнай асамблеі гэтай краіны Хорхе Радрыгес. Як вядома, замах на прэзідэнта Венесуэлы з выкарыстаннем дронаў быў здзейснены ў жніўні 2018 года. Да трыбуны, дзе знаходзіўся падчас параду Мадура, накіраваліся некалькі лятальных апаратаў з выбухоўкай. Раненні атрымалі некалькі гвардзейцаў, кіраўнік дзяржавы не пацярпеў.

Як бачым, гэтая гісторыя надзвычай мутная і ў ёй досыць шмат цёмных плям. Дзіўна, што шакавальная падзея ў Гаіці не выклікала заўважных водгукаў у свеце. З заяў міжнародных арганізацый можна згадаць хіба што фактычна пратакольнае выказванне старшыні Генеральнай Асамблеі ААН Волкана Базкыра. Ён заклікаў правесці дбайнае расследаванне ўсіх абставін забойства прэзідэнта Жавенэля Маіза. «Неабходна вызначыць тых, хто нясе адказнасць за гэтае злачынства, і дамагчыся справядлівасці. Нельга дапусціць, каб узялі верх страх і тэрор», — адзначаецца ў заяве Базкыра, зачытаным на цырымоніі ў памяць аб прэзідэнце Гаіці ў зале Генеральнай Асамблеі ААН. Аднак можна сказаць дакладна: адну з найбяднейшых краін свету чакаюць складаныя часы. Зрэшты, як апошнія некалькі стагоддзяў.

**Захар БУРАК.**

# НЯМА КАЛІ СТАРЭЦЬ

## Ці магчыма захаваць маладосць мозгу да глыбокай старасці

**Сярэдняя працягласць жыцця чалавека ўзрасла, і пытанне захавання маладосці мозгу сёння асабліва актуальнае. Як і арганізм у цэлым, наш мозг схільны да старэння: з гадамі яму ўсё больш складана выконваць свае функцыі. У якім узросце пачынаецца старэнне мозгу? Якімі сімптомамі яно суправаджаецца? Што рабіць, каб захаваць ясны розум да глыбокай старасці? І наогул, ці можна не быць старамодным, калі табе далёка за сорак? Пра гэта наша гутарка з галоўным герантолагам Міністэрства аховы здароўя Беларусі, кіраўніком Рэспубліканскага цэнтра актыўнага даўгалецця Людмілай ЖЫЛЕВІЧ.**

### СТАРАМОДНАСЦЬ — ГЭТА... РАЗУМНА?

Старамоднасць і рэтраградства многім здаюцца сінонімамі, аднак гэта розныя паняцці, кажа галоўны герантолаг Беларусі. І калі першае — гэта стан душы, другое можа быць сур'ёзным сімптомам.

— Старамоднымі можна назваць людзей, якія жывуць па ўласных правілах. Яны не адмаўляюць прагрэсу, проста ім камфортней прытрымлівацца прынцыпаў, якія некаторым могуць здацца састарэлымі.

Часам старамоднасць — праява мудрасці, кажа суразмоўца. Чалавек зразумеў свае жаданні і памкненні, навучыўся прымаць і паважаць іх. Не варта раўняць старамоднасць і адсталасць. Старамодныя людзі нярэдка ў курсе тэндэнцый сённяшняга дня. Проста ім камфортней ва ўчарашнім дні. Яны карыстаюцца дабротамі цывілізацыі, хоць і не так неразумна, як ласая на моду моладзь.

Але ёсць паняцце «рэтраградства», і яго наўрад ці можна назваць станоўчай з'явай. Рэтраграды — гэта людзі, якія не хочуць успрымаць нічога новага, часта насуперак здароваму сэнсу. Прычыны могуць быць дзве. Першая — перад намі проста кансерватыўны да мозгу касцей чалавек. Ён застыў у пэўным узросце і не гатовы крытычна ацэньваць перавагі перамен у жыцці. А другая — гэта сур'ёзныя праблемы з сасудамі і мазгавым кровазваротам, якія спачатку блізкія ацэньваюць як «сапсаваўся характар».

— У выніку старэння дэгенератыўныя змены мозгу і сасудаў выяўляюцца кагнітыўным зніжэннем, — кажа Людміла Жылевіч. — Калі актыўнаму чалавеку раптам усё становіцца нецікава і ён пачынае замыкацца ў сабе.

Сёння не пайшоў на футбол, хоць раней быў футбольным фанатам, заўтра не пацікавіўся, як здала экзамен любімая ўнучка, а паслязаўтра перастаў без крайняй неабходнасці выходзіць з дому.

— Гэта звязана з праблемамі старэння мозгу, і такія праявы могуць пачацца досыць рана (часам у 45—50 гадоў). У маладым узросце яны могуць быць звязаны з чэрапна-мазгавымі траўмамі, у выніку якіх адбываюцца змены ў структуры галаўнога мозгу, у больш сталым — з памяншэннем кровазабеспячэння мозгу, змяненнем структуры. Гэта могуць быць з'явы, звязаныя з мікраінсультамі. І вось у чалавека арганічнае паражэнне мозгу, а яго сям'і здаецца, што ў яго «сапсаваўся характар», што ён «стаў рэтраградам».

### ПАЛІЧЫЦЕ РЭШТУ

***— Ці можна захаваць жаданне заставацца сучасным і ў сталым узросце?***

— Я ведаю тых, у каго і на дзявятым дзясятку вялікая цікавасць да жыцця, у іх блішчаць вочы, і яны не ставяць сабе псіхалагічных перашкод. Але ў нас прынята досыць рана казаць сабе «я стары» (гэтую фразу можна пачуць ад чалавека і ў 50 гадоў). Можа быць, такія людзі хочуць пачуць камплімент, але нямала і тых, хто цалкам сур'ёзны. А старасць у любога з нас пачынаецца з таго моманту, калі вы кажаце сабе: «Я стары», «Я не павінен ставіць сабе новыя задачы», «Буду дажываць». Такі чалавек пачынае жыць толькі мінулым. Ён забараніў сабе глядзець наперад ці ў яго адбыліся змены мозгу, якія не дазваляюць яму жыць актыўным жыццём і цікавіцца тым, што адбываецца вакол. У абодвух выпадках, каб пазбегнуць цяжкіх наступстваў (а канчатковы пункт гэтага шляху — хуткая дэменцыя), неабходна работа з пацыентам. Між тым, калі блізкія нарэшце ўсведамляюць неабходнасць медыцынскай дапамогі, урачам даводзіцца мець справу ўжо з запушчанымі стадыямі. Таму так важна ведаць першыя прыкметы кагнітыўных змяненняў.



— Перш за ўсё, гэта праблемы з памяццю, якія вашы блізкія старанна хаваюць. Гэта і запісачкі самому сабе, і дагаворная невыканаўчасць (чалавек рэгулярна забывае аб сустрэчы або абяцанні патэлефанаваць). Па некалькі разоў у размове такі чалавек паўтарае адны і тыя ж фразы і па дзесяць разоў правярае, сыходзячы з хаты, ці выключаны прас, газ і святло. Яшчэ адзін сімптом — чалавек кажа толькі аб мінулым. Успамінае дэталі дзесяцігадовай даўніны, але не ў стане падрабязна аднавіць падзеі ўчарашняга дня. І, нарэшце, у такога чалавека ў першую чаргу пакутуе ўменне лічыць у розуме: неабходнасць палічыць рэшту ўвесці яго ў ступар.

### АПТЫМІСТЫ СТАРЭЮЦЬ ГАРМАНІЧНА

З павелічэннем працягласці жыцця нейрафізіёлагі заўважылі выразную сувязь паміж захаваннем функцый мозгу і фізічнай нагрузкай.

— Калі вы хочаце захаваць маладосць мозгу і ў вельмі сталым узросце, вам неабходна рэгулярная фізічная нагрузка. Зразумела, з гадамі яе інтэнсіўнасць будзе памяншацца, але нагрузка павінна быць штодзённай.

***— Ці можна спыніць працэс старэння мозгу на раннім этапе?***

— Так, зразумела. У першую чаргу неабходна стабілізаваць захворванні, якія ўплываюць на кровазабеспячэнне мозгу, — кантраляваць ціск, знізіць халестэрын, цукар крыві і г. д. Акрамя таго, вы павінны жыць актыўным жыццём, але не забываць пра адпачынак. Калі вас вымотвае праца, бліжэй да пенсіі ў ідэале варта было б скараціць яе аб'ём і знізіць тэмп, зыходзячы са стану вашага здароўя. На ранніх стадыях захворвання, каб не дапусціць яго развіцця, чалавек павінен кожны дзень падаграваць у сабе цікавасць да нечага. Калі не можа сам — ёсць сям'я, дзеці і ўнукі, нават псіхолагі і псіхатэрапеўты, да якіх можна звярнуцца. Дапамажыце бабулі асвоіць камп'ютар, пакажыце магчымасці смартфона — у яе знікне страх перад інтэрнэтам. А калі яна адкрые для сябе свет зносін у месенджарах (дзе можна ўбачыць суразмоўцу), у яе жыцці павялічыцца найважнейшы для здароўя мозгу сацыяльны кампанент. Калі змены ў мозгу ўжо ёсць, патрэбныя таксама кагнітыўныя трэнінгі — яны маюцца на сайце геранталагічнага цэнтра (а можна прывезці блізкага чалавека ў наш кабінет нейрафітнесу).

Формула простая, удакладняе спецыяліст. Каб захаваць маладосць мозгу, неабходныя фізічная нагрузка, сацыяльная актыўнасць, цікавасць да жыцця і імкненне ўспрымаць рэчаіснасць пазітыўна. Адзінота, замкнёнасць, гіпадынамія — шлях да старэння мозгу.

— Каб нашы пажылыя людзі заставаліся актыўнымі, каб не сыходзілі ў псіханеўралагічныя дыспансеры ў стане, калі дэменцыя не паддаецца карэкцыі, вельмі важна, каб яны выходзілі за свае платы. Мы страцілі пляцоўкі, дзе людзі маглі б збірацца, каб мець зносіны.

Калісьці ў дварах гулялі ў даміно і шахматы пажылыя мужчыны, а пенсіянеркі сядзелі на лавачках, кажа суразмоўца. Зараз вы не ўбачыце месца, дзе можа прысесці пажылы чалавек. Лавачкі ёсць, але яны — пад адкрытым небам: летам — пад пякучым сонцам, зімой — пад снегам і дажджом. Нават калі пажылы чалавек дабярэцца да лавачкі, доўга на ёй не выседзіць. А на лавачцы пенсіянер мог бы сустрэцца з аднагодкамі. Не кажучы ўжо пра тое, што спусціцца ў двор, калі ў пяціпавярховіка няма ліфта, можа далёка не кожны пенсіянер. У невялікіх вёсках раней людзі збіраліся каля крам, цяпер замест крам — аўтакрамы. Такім чынам, мы самі стварылі асяроддзе, якое спрыяе росту ранняй дэменцыі.

— Калі вы маеце зносіны, уключаецца вялікая колькасць кампанентаў: вы выбіраеце тэму размовы, успрымаеце суразмоўцу, заўважаеце, як ён успрымае вас. Мозг рэагуе на дзясяткі раздражняльнікаў зыходзячы з таго, як развіваецца дыялог. Ідзе разумовая праца. У сетцы вы апрыёры гаспадар становішча: захачу — і «выключу» суразмоўніка. Няма процідзеяння, якое падштурхнула б работу мозгу. Таму хачу падкрэсліць: сацыяльныя сеткі — гэта не сацыяльныя сувязі. Наш мозг разлічаны на глядзельны і маўленчы кампаненты: вы павінны, размаўляючы, глядзець суразмоўцу ў вочы. Гэта, дарэчы, актуальна і для моладзі, бо сталасць прыйдзе да кожнага.

### ЧАМУ ВАЖНА ЛАМАЦЬ ГАЛАВУ

Ну, а галоўны прынцып захавання маладосці мозгу ў любым узросце — трэніроўка розуму, сцвярджае галоўны герантолаг краіны. Выдатныя навукоўцы, мысліцелі, пісьменнікі, якія захоўваюць яснасць розуму ў вельмі шаноўных гадах, дасягаюць гэтага, таму што кожны дзень трэніруюць свой мозг: разважаюць, вырашаюць тэарэтычныя задачы, ламаюць галаву. Але вельмі часта звычайны чалавек, выходзячы на пенсію, вырашае: «Усё, я адпрацаваў». І перастае развівацца.

— У жыцці пенсіянераў сёння адсутнічае друкаванае слова — і гэта вялікая праблема. Раней пажылыя людзі выпісвалі газеты і часопісы. Сёння гэта не модна. Навіны ў інтэрнэце даступныя не ўсім пенсіянерам, чытаць мастацкую літаратуру таксама гатовы не кожны з іх. Між тым менавіта чытанне задзейнічае ўсе аддзелы мозгу, у той час як відэаінфармацыя — тэлевізар, які ў многіх працуе фонам, — не дае мозгу неабходнай нагрузкі. Менавіта чытанне — найважнейшы кампанент захавання функцый мозгу. Таму тыя члены сям'і, якія адказныя за пажылога чалавека, проста абавязаны забяспечыць яго магчымасцю чытаць. Выпішыце выданні, якія будуць яму цікавыя, купіце папяровыя кнігі, дайце лупу і падбярыце акуляры.

Разгадванне крыжаванак, рашэнне галаваломак таксама трымаюць мозг у тонусе. І асабліва — настольныя гульні, якія ўключаюць кампанент зносін і спаборніцтва.

Важны прынцып падтрымання працаздольнасці мозгу, кажуць герантолагі, гэта яго штодзённае выкарыстанне. Галіны ведаў, новыя для нашага мозгу, дадуць максімальны прырост новых нейронных сувязяў.

— Тое, што не выкарыстоўваецца, рудыментуецца, — адзначае Людміла Жылевіч. — Гэта правамерна для любога органа, у тым ліку і мозгу. Вывучайце новае, колькі б гадоў вам не было. Навошта? Для сябе! Яшчэ адна наша традыцыйная праблема — мы ўсё робім для кагосьці. Для дзяцей, мужа, начальніка, для кар'ернага росту і г. д. Неабходна зразумець, што ў першую чаргу развіццё патрэбна самому сабе.

Менавіта ў другой палове жыцця асабліва важнае пытанне, якія мэты і задачы ты сабе ставіш, падкрэслівае Людміла Жылевіч. Ці не спыняешся ты ў развіцці, ці не кажаш сабе: «Я не маю на гэта права, таму што я ўжо стары».

— Вядома, тут патрэбен разумны падыход. Калі вы, напрыклад, у 65 гадоў вырашылі ўпершыню ўстаць на скейтборд, падумайце аб бяспецы — рызыка пераломаў у вас у дзясяткі разоў вышэйшая, чым у моладзі. Трэба ўзважыць усе «за» і «супраць». Але самае галоўнае — мы не павінны ставіць сабе псіхалагічных перашкод. Людзі, якія працуюць над сабой, імкнуцца развівацца разумова і фізічна, выгадна адрозніваюцца ад сваіх аднагодкаў, што пагадзіліся «быць старымі».

***— Ад тых, хто кажа «Што за моладзь зараз!» і «У наш час было лепш»?***

